В. Т. Тамукевіч М. А. Урбан

МАТЭМАТЫКА





5

Частка 1

В. Т. Тамукевіч М. А. Урбан

МАТЭМАТЫКА

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 1

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2013

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 51(075.3=161.3)-056.263
ББК 22.1я71
Т17

Рэцэнзенты: кафедра дашкольнай і пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» (кандыдат педагагічных навук, дацэнт *З. К. Ляўчук*); настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Віцебская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей з парушэннем слыху» *І. К. Грэсік*

Пераклад з рускай мовы *Т. М. Ракіцкай*

Умоўныя абазначэнні:

— гавары так

— запісвай так

— заданне на кемлівасць

Тамукевіч, В. Т.

Т17 Матэматыка : вучэб. дапам. для 5-га кл. спец. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / В. Т. Тамукевіч, М. А. Урбан; пер. з рус. мовы Т. М. Ракіцкай. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2013. — 144 с. : іл.

ISBN 978-985-471-602-2.

Распрацаваны ў адпаведнасці са зместам прадметнай вобласці «Матэматыка» дзеючых праграм, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2008 г. (для спецыяльных агульнаадукацыйных устаноў для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы і дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай і рускай мовамі навучання, для дзяцей з парушэннем слыху).

У дапаможніку рэалізуюцца як асноўныя дыдактычныя прынцыпы, так і прынцып карэкцыйнай накіраванасці. Прадугледжана вялікая колькасць схем, апор, слоў-апор для засваення матэрыялу. Разам з тым шэраг заданняў накіраваны на самастойнае складанне задач і прыкладаў.

Вучэбны дапаможнік для 5-га класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ з беларускай мовай навучання для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы, для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні, для дзяцей з парушэннем слыху.

УДК 51(075.3=161.3)-056.263
ББК 22.1я71

ISBN 978-985-471-602-2 (ч. 1)
ISBN 978-985-471-604-6

© Тамукевіч В. Т., Урбан М. А., 2013
© Ракіцкая Т. М., пераклад на беларускую мову, 2013
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2013

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ПАЎТАРЭННЕ

Урок 1

1. Прачытай і запішы лікі.

Шэсць тысяч шэсць	*Трыста восемдзесят пяць*
Дзевяцьсот трыццаць	*Тры тысячы сямнаццаць*

2. Запішы і прачытай лікі.

5 соц. 8 дзяс. 2 адз.
5 тыс. 8 соц. 0 дзяс. 1 адз.
9 тыс. 2 сот. 3 дзяс. 0 адз.

8 соц. 4 дзяс. 3 адз.
6 соц. 0 дзяс. 7 адз.
4 сот. 0 дзяс. 1 адз.

3. Запішы лікі, якія ідуць за лікамі:

431 3970 6024 9999 509

4. Рашы ўраўненні.

$x + 46 = 60$ $a - 36 = 14$ $41 - k = 36$

5. Рашы задачу.

Ад рулона тканіны адрэзалі кавалак. З яго пашылі 20 сукенак, расходуючы па 3 м на кожную сукенку. Колькі ўсяго метраў тканіны было ў кавалку, калі ў ім засталося 18 м?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Рашы задачу.

На хлебазавод прывезлі 240 мяшкоў мукі на 8 аўтамашынах. На кожную аўтамашыну грузілі аднолькавую колькасць мяшкоў. Колькі мяшкоў мукі прывезлі на адной аўтамашыне?

7. Начарці ломаную з 5 звёнаў. Абазнач яе лацінскімі літарамі. Прачытай назву.

Урок 2

1. Прадстаў лікі ў выглядзе сумы разрадных складаемых.

7486 58 6071 407 4590 2009 4478

2. Якія значэнні літары падыходзяць?

$609 > a$ $407 > b$ $94 < c$ $4327 < x$

3. Параўнай.

1989 ☐ 889 9967 ☐ 9769 8920 ☐ 8290

4. Параўнай.

4209 + 1376 ☐ 2490 + 2245 9345 – 248 ☐ 9120

5. Вылічы.

75 : 5 + 18	64 : 16 + 55	84 : 21 + 17 · 3
32 : 8 + 44	80 – 70 : 14	12 · 4 – 72 : 18
48 – 56 : 8	65 – 45 : 15	11 · 7 – 9 · 0

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Рашы задачу двума спосабамі.

У садзе пасадзілі 4 рады сліў і 5 радоў груш. Колькі ўсяго дрэў пасадзілі ў садзе, калі ў кожным радзе было па 20 дрэў?

7. Рашы задачу вусна.

З лесу трэба вывезці 34 бервяны. Трактар за адзін рэйс вывозіць 9 бярвёнаў. Колькі рэйсаў трэба зрабіць трактару? Па колькі бярвёнаў ён будзе перавозіць за кожны рэйс?

8. Начарці адрэзак, чацвёртая частка якога роўна 3 см.

Урок 3

1. Прачытай умову задачы. Растлумач, што абазначаюць выразы. Складзі пытанне. Рашы задачу.

У сераду бібліятэку наведалі 60 чалавек, у чацвер — на 25 чалавек менш, а ў пятніцу — у 3 разы больш, чым у чацвер.

60 – 25 60 + (60 – 25) (60 – 25) · 3

2. Прадстаў лікі 756, 5609, 4300, 9899, 309 у выглядзе сумы разрадных складаемых.

3. Вылічы сумы.

Складаемае	657	381	104	1731	3081	2557
Складаемае	430	616	793	3908	1645	2326

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Знайдзі значэнні выразаў.

$a + 146$, пры $a = 412$, $a = 378$, $a = 720$
$2368 + b$, пры $b = 1462$, $b = 2300$, $b = 7123$

5. Рашы задачу.

Провад разрэзалі на 3 часткі, даўжыні якіх 456 дм, 809 дм, 787 дм. Якой даўжыні быў провад?

6. Выразі ў метрах і сантыметрах.

507 см 305 см 1260 см 5749 см

7. Назаві геаметрычныя фігуры.



Урок 4

1. Рашы задачу двума спосабамі.

Трэба адрамантаваць 3999 м дарогі. У першы дзень адрамантавалі 1456 м, а ў другі дзень — 2099 м. Колькі метраў дарогі засталося адрамантаваць?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Запішы лікі. Параўнай.

3 тыс. 8 соц. 4 адз. ☐ 4 тыс. 5 соц. 3 адз.
8 тыс. 4 сот. 9 адз. ☐ 8 тыс. 9 соц. 4 адз.

3. Рашы ўраўненні. Выканай праверку.

$a + 2881 = 7452$ $\quad$ $2289 + c = 7462$
$1000 - b = 923$ $\quad$ $y - 5000 = 2456$

4. Якія лікі прапушчаны?

$$\begin{array}{r} 1327 \\ +\ \square\square\square\square \\ \hline 5714 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 795 \\ +\ \square\square\square \\ \hline 1000 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 8999 \\ -\ \square\square\square\square \\ \hline 3987 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 1000 \\ -\ \square\square\square \\ \hline 785 \end{array}$$

5. Выразі ў сантыметрах і міліметрах.

347 мм $\quad$ 261 мм $\quad$ 459 мм $\quad$ 101 мм

6. Рашы задачу.

Маса аўтамабіля з грузам 13 ц, а маса грузу ў ім — 400 кг. Якая маса аўтамабіля без грузу?

7. Колькі часу будуць паказваць гадзіннікі праз 1 г 15 мін?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

8. Начарці прамавугольнік, у якога адна старана ў 2 разы карацейшая за другую старану.

Урок 5

1. Рашы задачу.

У двух аўтобусах ехалі 59 чалавек. Калі з аднаго аўтобуса выйшлі 15 чалавек, у аўтобусах засталося пасажыраў пароўну. Колькі чалавек было ў кожным аўтобусе спачатку?

2. Устаў адпаведныя лікі.

95 – 80 > □ 1476 + 231 < □
457 + 43 = □ 2461 + 6547 > □
6720 – 4400 < □ 8579 – 2387 = □

3. Рашы ўраўненні.

$x \cdot 3 = 1233$ $y : 6 = 1543$ $6000 : c = 3000$

4. Выразі ў кілаграмах.

4 ц 5 ц 67 кг 8 ц 30 кг 19 ц 12 кг

5. Складзі выразы і знайдзі іх значэнні.

- Рознасць лікаў 5358 і 2314 падзяліць на 2.
- Суму лікаў 630 і 270 падзяліць на 9.
- Суму лікаў 2487 і 4520 паменшыць на 6458.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Рашы задачу.

У двух аўтобусах ехалі 29 чалавек. Калі ў адзін аўтобус увайшлі 17 чалавек, у аўтобусах стала пасажыраў пароўну. Колькі чалавек стала ў кожным аўтобусе?

7. Вылічы.

12 г 35 мін + 22 г 15 мін 6 дм 9 см + 21 дм
11 г 15 мін + 240 мін 42 см · 5

8. Дапоўні сказы.

Перадача доўжылася паўгадзіны або 30 ... .
Каця гуляла на двары 60 мін або 1 ... .
Мы былі ў дарозе 24 г або 1 ... .
Мой дзень нараджэння праз 1 год або праз 12 ... .
У Арсеня дзень нараджэння праз паўгода або праз 6 ... .
Лета доўжыцца чацвёртую частку года або 3 ... .

Урок 6

1. Прачытай выразы.

5600 : 5 5460 : 7 9465 : a $a : b + c$

2. Паменшы кожны лік на 120. Павяліч кожны лік у 2 разы.

3472 2325 2900 1410 1400

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Рашы задачу.

Пашылі аднолькавую колькасць спадніц і сукенак. На кожную спадніцу пайшло 2 м тканіны, а на кожную сукенку — 3 м. На ўсе сукенкі пайшло 66 м тканіны. Колькі метраў тканіны спатрэбілася на ўсе спадніцы?

4. Складзі і рашы задачу.

Маса 1 пакета, кг	Колькасць пакетаў, шт.	Маса ўсіх пакетаў, кг
аднолькавая	16	64
	14	?

5. Ці магчыма гэта? Падбяры адпаведныя адзінкі вымярэння.

Даўжыня ручкі 15 мм
Таўшчыня сшытка 5 км
Маса чалавека 65 ц
Даўжыня кабінета 7 км
Вышыня дома 17 км
Рост чалавека 1 км 72 м
Маса кавуна 9 г
У сутках 24 месяцы

6. Вылічы.

7200 : 6 + 2800 : 7
1350 : 5 – 68
9164 : 4 + 3561
1255 : 5 · 3

7. Рашы задачу.

Дзевятнаццаць вагонаў таварнага цягніка складаюць трэцюю частку ўсяго саставу. Колькі вагонаў у таварным цягніку?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

8. Цяпер 23 г. Які час сутак будзе праз 12 г? Праз 16 г? Праз 24 г?

Урок 7

1. Вылічы вусна.

320 + 80	130 + 70	570 – 30
1200 + 300	450 + 240	560 – 50

2. Складзі пытанне да задачы і рашы яе.

У кніжнай шафе 5 паліц. На трох паліцах — па 90 кніг, а на дзвюх — па 110 кніг.

3. Чацвёртая частка перыметра квадрата роўна 14 см. Знайдзі перыметр квадрата.

4. Вылічы.

(867 – 848) · 3	(76 : 19) · 15
(600 – 576) · 4	(80 : 16) · 7
(190 + 110) · 3	(52 : 13) · 12

5. Рашы задачу.

Бацька і сын акопвалі кусты парэчкі. Бацька за адну гадзіну акопваў 5 кустоў, а сын — 3 кусты. Ім трэба акапаць 24 кусты. Колькі часу яны павінны працаваць разам?

6. Запішы паводле ўзору.

1245 см = 12 м + 4 дм + 5 см

689 см 4506 см 1050 см 8000 см

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Запішы пяць лікаў, кожны з якіх змяшчае 37 дзясяткаў.

8. Які лік у 8 разоў меншы за лікі?

984 992 1560

Урок 8

1. Складзі выразы і знайдзі іх значэнні.

- Да двух тысяч трыццаці пяці дадаць дзве тысячы трыццаць восем.
- Ад васьмі тысяч шасцідзесяці пяці адняць адну тысячу дзвесце сорак дзевяць.
- Адну тысячу трыста дваццаць пяць павялічыць у 2 разы.

2. Вылічы.

2456 : (402 – 394) 397 – 2037 : 7 284 · 3 – 26

3. Знайдзі перыметры фігур.



4. Выразі ў кіламетрах і метрах.

5243 м 6148 м 2050 м 1009 м

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Складзі ўмову задачы, выкарыстоўваючы даныя дыяграмы. Рашы задачу.

Вызнач масу 5 дынь і 2 кавуноў.



6. Вылічы.

5 км + 3341 м	7 кг – 863 г	2 сут. – 24 г
140 м · 5	6 т · 4	17 г · 3

7. Параўнай.

5 км ☐ 6000 м	8 кг ☐ 4 т
2 км ☐ 300 дм	37 ц ☐ 86 кг
24 г ☐ 10 г	45 г ☐ 240 мін

8. Рашы задачу.

Аўтобус ехаў да прыпынку 5 г са скорасцю 72 км/г. Гэта склала $\frac{1}{3}$ частку ўсяго шляху. Якую адлегласць павінен быў праехаць аўтобус?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

НУМАРАЦЫЯ ЛІКАЎ АД 1 ДА 1 000 000

Урок 9

10 тысяч — гэта дзясятак тысяч.
10 дзясяткаў тысяч — гэта сотня тысяч.
10 соцень тысяч — гэта мільён.

Параўнай лікі, якія паказаны на малюнках і ў табліцы.



II клас — клас тысяч			I клас — клас адзінак		
Сотні тысяч	Дзясяткі тысяч	Адзінкі тысяч	Сотні	Дзясяткі	Адзінкі
			2	4	3
2	4	3	0	0	0

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Запомні!

Адзінкі, дзясяткі і сотні складаюць першы клас, або клас адзінак.

Адзінкі тысяч, дзясяткі тысяч і сотні тысяч складаюць другі клас, або клас тысяч.

1. Прачытай лікі. Назаві разрады, якія складаюць першы клас; другі клас.

546 000 324 000 758 000 843 000

У ліку 546 000 змяшчаюцца 5 соцень тысяч, 4 дзясяткі тысяч, 6 адзінак тысяч. Гэтыя разрады складаюць клас тысяч.

У ліку 546 000 запісаны тры нулі ў класе адзінак. Гэта абазначае, што ў ліку адсутнічаюць адзінкі першага класа.

2. Рашы задачу.

Цягніку трэба праехаць 642 км. Ён ужо праехаў трэць шляху. Колькі кіламетраў засталося праехаць цягніку?

3. Рашы задачу.

На 3 машынах перавезлі 5364 кг грузу, пароўну на кожнай. Колькі кілаграмаў грузу могуць перавезці 5 такіх машын?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Параўнай, не вылічваючы.

459 – 240 – 148 ☐ 459 – (240 – 148)
459 + 240 + 148 ☐ 459 + (240 + 148)
144 : 4 – 3 ☐ 144 : (4 – 3)

5. Здагадайся, колькі часу паказваюць гадзіннікі. На якім цыферблаце вугал паміж гадзіннай і мінутнай стрэлкамі тупы?



Урок 10

Разгледзь табліцу класаў і разрадаў і прачытай мнагазначныя лікі.

II клас — клас тысяч			**I клас — клас адзінак**		
Сотні тысяч	Дзясяткі тысяч	Адзінкі тысяч	Сотні	Дзясяткі	Адзінкі
1	3	7	2	6	4
3	5	1	6	9	2
	2	0	5	5	3
		3	0	0	4

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вылучаю ў ліку 137 264 класы адзінак і тысяч. Спачатку прачытаю, колькі ў ліку адзінак другога класа — класа тысяч.
Потым прачытаю, колькі ў ліку адзінак першага класа — класа адзінак.
Чытаю лік: сто трыццаць сем тысяч дзвесце шэсцьдзясят чатыры.

1. Прачытай лікі.

2345 203 550 40 600 54 001 755 809

2. Устаў прапушчаныя лікі.

761 см = ☐ м ☐ см = ☐ м ☐ дм ☐ см
604 см = ☐ м ☐ см = ☐ м ☐ дм ☐ см
1250 см = ☐ м ☐ см = ☐ м ☐ дм ☐ см
32 514 см = ☐ м ☐ см = ☐ м ☐ дм ☐ см

3. Рашы задачу.

Паміж дамамі Міці і Пеці 1200 м. Хлопчыкі выйшлі насустрач адзін аднаму. Міця прайшоў $\frac{1}{6}$ частку ўсёй адлегласці, а Пеця — 200 м. Хто прайшоў большую адлегласць? Колькі метраў засталося прайсці хлопчыкам?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Рашы задачу.

Мікіта спампаваў некалькі відэаролікаў на 12 мін прагляду. Кожны відэаролік доўжыцца 2 мін. Паша спампаваў столькі ж відэаролікаў, па 3 мін кожны. Колькі мінут можа глядзець свае ролікі Паша?

5. Знайдзі $\frac{1}{4}$ частку гадзіны; $\frac{1}{2}$ частку гадзіны.

6. З дапамогай адказаў да задання 5 растлумач розныя спосабы чытання паказанняў гадзіннікаў.



12 г 15 мін (чвэрць першай)	12 г 30 мін (палова першай)	12 г 45 мін (без чвэрці гадзіна)

7. Вызнач плошчы незафарбаваных фігур.







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Трэба запісаць лік «трыста адна тысяча дваццаць чатыры».

Спачатку запішу, колькі ў ліку адзінак другога класа — класа тысяч. Калі разрадныя адзінкі ў класе тысяч адсутнічаюць, пішу на іх месцы лічбу 0.

Потым запішу, колькі ў ліку адзінак першага класа — класа адзінак. Калі разрадныя адзінкі ў класе адзінак адсутнічаюць, пішу на іх месцы лічбу 0.

301 024.

1. Прачытай і запішы лікі.

Шэсцьсот дваццаць чатыры тысячы пяцьсот дваццаць пяць
Трыста дваццаць адна тысяча шэсцьсот чатыры
Пяцьсот восем тысяч трыццаць чатыры
Семсот адзінаццаць тысяч адзін
Пятнаццаць тысяч дваццаць
Дзевяцьсот тысяч дзевяць

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Параўнай.

65 дм 7 см ☐ 6 м 57 см 4 м 8 дм ☐ 84 см

52 м 52 см ☐ 52 м 6 дм 240 см ☐ 24 дм

3. Колькі лікаў ад 1 да 30 дзеляцца на 3?

4. Рашы ўраўненні.

$460 - a = 460$ $c - 341 = 408$ $2 \cdot d = 90$

5. На дыяграме паказаны прыкладныя адлегласці ад Мінска да абласных цэнтраў. Дапоўні ўмову задачы данымі дыяграмы. Рашы задачу.

Першы аўтобус выйшаў з Мінска ў Брэст і вярнуўся назад, а другі аўтобус зрабіў два рэйсы з Мінска ў Магілёў і назад. Які аўтобус прайшоў большую адлегласць? На колькі кіламетраў большую?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Вылічы.

560 : 7	800 · 2	480 : 8 + 230
5600 : 70	4 · 500	280 : 40 · 3
3600 : 90	3000 · 2	400 · 4 – 450

7. Рашы задачу.

Тата гуляў з сабакам 1 г 30 мін. Трэцюю частку гэтага часу тата патраціў на дарогу да парку і назад, а астатні час правёў з сабакам у парку. Колькі часу тата правёў з сабакам у парку?

8. Рашы задачу.

У васьмі аднолькавых мяшках 400 кг бульбы. Колькі такіх мяшкоў трэба, каб рассыпаць 800 кг бульбы?

Урок 12

Разгледзь, як лік 634 302 прадстаўляюць у выглядзе *сумы разрадных складаемых*.

634 302 = 600 000 + 30 000 + 4000 + 300 + 2

Разгледзь разрадны састаў гэтага ліку.

6 соц. тыс. 3 дзяс. тыс. 4 адз. тыс. 3 сот. 2 адз.

1. Прадстаў лікі ў выглядзе сумы разрадных складаемых.

456 894 209 407 123 620 790 123

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Назаві і запішы лікі, у якіх:

4 сот. тыс. 5 дзяс. тыс. 9 адз. тыс. 3 сот. 7 дзяс.
9 соц. тыс. 7 дзяс. тыс. 6 адз. тыс. 6 дзяс. 1 адз.
7 соц. тыс. 3 дзяс. тыс. 3 адз. тыс. 5 соц. 3 адз.
4 сот. тыс. 2 адз. тыс. 1 сот. 4 дзяс. 4 адз.
2 дзяс. тыс. 4 адз. тыс. 9 соц. 7 дзяс. 2 адз.

3. Вылічы.

$2448 : 8 - 306 : 6$ $\qquad$ $325 \cdot 4 + 325$
$419 \cdot 2 + 3456$ $\qquad$ $217 \cdot 4 - 352$
$910 : 13 \cdot 3$ $\qquad$ $6250 - 1960 \cdot 0$

4. Рашы задачу.

Прывезлі 75 машын бульбы, па 3 т на кожнай. Гэта складае $\frac{1}{3}$ частку бульбы, якую трэба прывезці. Колькі тон бульбы трэба прывезці?

5. Якімі лікамі трэба дапоўніць табліцу?
Складзі і рашы задачу.

Колькасць гадзін у 1 сутках	Колькасць сутак	Колькасць гадзін ва ўсіх сутках
▢	6	? } ?
▢	3	?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Вылічы.

455 : 7 – 65 35 · 4 + 3387 9000 – 752 : 8

7. Начарці прамавугольнік са старанамі 3 см і 1 см. Знайдзі яго плошчу і перыметр.

Урок 13

Мнагазначныя лікі параўноўваюць паразрадна.



Пачынаю параўноўваць з вышэйшых разрадаў класа тысяч. Параўноўваю сотні тысяч. Большы той лік, у якім больш соцень тысяч.

Калі соцень тысяч у адным ліку столькі ж, колькі ў другім, параўноўваю дзясяткі тысяч. Большы той лік, у якім больш … .

Калі дзясяткаў тысяч у адным ліку столькі ж, колькі ў другім, параўноўваю … . Большы той лік, у якім больш … .

Працягваю разважаць гэтак жа, параўноўваючы сотні, дзясяткі і адзінкі класа адзінак.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Параўнай лікі.

239 ☐ 198
345 ☐ 348
330 000 ☐ 329 990

32 347 ☐ 34 474
53 780 ☐ 53 560
546 824 ☐ 546 284

2. Параўнай лікі.

23 564 ☐ 3546
93 487 ☐ 9487
3671 ☐ 78 902

5670 ☐ 27 456
78 000 ☐ 87 000
4598 ☐ 98 478

Калі ў двух ліках колькасць лічбаў розная, то большы той лік, у якім лічбаў больш.
У ліку 23 564 лічбаў больш, чым у ліку 3546. Значыць, лік 23 564 большы, чым лік 3546.

3. Складзі ўраўненні і рашы іх.

- Ад якога ліку трэба адняць 684, каб атрымаць 58?
- Да якога ліку трэба дадаць 367, каб атрымаць 983?
- Які лік трэба памножыць на 3, каб атрымаць 582?

4. Рашы задачу.

Каб зрабіць рамонт у доме, купілі 880 дошак. Палова дошак пайшла на рамонт падлог у пакоях, а 120 дошак — на рамонт падлог у кухнях. Колькі дошак засталося?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Вылічы.

(867 – 848) · 3 76 : 19 · 15
(600 – 104) : 4 80 : 16 · 70

6. Складзі і рашы задачу пра наведвальнікаў кафэ.

Наведвальнікаў за адным столікам	Колькасць столікаў	Усяго наведвальнікаў
4	аднолькавая	20
?		30

7. Выберы схему. Рашы задачу.

Магазін атрымаў 960 пар абутку. Дзіцячага абутку было ў 3 разы менш, чым абутку для дарослых. Колькі пар дзіцячага абутку атрымаў магазін?

8. Рашы задачу.

У школьным музеі народных рамёстваў 476 экспанатаў. Адну сёмую частку ўсіх экспанатаў прынеслі бацькі, а астатнія сабралі самі школьнікі. Колькі экспанатаў сабралі школьнікі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

9. Назаві прамыя, вострыя, тупыя вуглы.



Урок 14

1. Запішы лікі, у якіх:

56 адзінак	56 адзінак класа тысяч
20 адзінак	20 адзінак класа тысяч
301 адзінка	301 адзінка класа тысяч

56 адзінак — гэта 5 дзясяткаў і 6 адзінак.
56 адзінак класа тысяч — гэта 5 дзясяткаў тысяч і 6 адзінак тысяч.

56	56 000

2. Запішы лікі, у якіх:

19 дзясяткаў	19 дзясяткаў класа тысяч
2 сотні	2 сотні класа тысяч
40 дзясяткаў	40 дзясяткаў класа тысяч

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

19 дзясяткаў — гэта 1 сотня і 9 дзясяткаў.
19 дзясяткаў класа тысяч — гэта 1 сотня тысяч і 9 дзясяткаў тысяч.

190 | 190 000

3. Колькі ў ліках усяго тысяч? Усяго дзясяткаў тысяч? Усяго соцень? Усяго дзясяткаў?

625 304 | 104 327 | 921 076

У ліку 625 304 усяго

625 304 625 тысяч,
625 304 62 дзясяткі тысяч,
625 304 6253 сотні,
625 304 62 530 дзясяткаў.

4. Параўнай.

400 070 ☐ 407 000
66 000 ☐ 606 000
40 000 ☐ 39 999

103 000 ☐ 100 300
60 500 ☐ 65 000
20 100 ☐ 20 010

5. Запішы і параўнай лікі.

- Шэсцьсот пяцьдзясят і шэсцьсот пяцьдзясят тысяч.
- Дзевяноста тысяч і дзевяцьсот тысяч.
- Чатырыста тысяч і чатырнаццаць тысяч.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Вызнач па табліцы, колькі кілаграмаў розных прадуктаў засталося ў школьнай сталовай. На колькі кілаграмаў больш засталося круп, чым бульбы? У колькі разоў больш засталося капусты, чым мукі?

	Мяса, кг	Мука, кг	Крупы, кг	Бульба, кг	Капуста, кг
Атрымана	3200	2500	4000	8000	7100
Зрасходавана	2900	2200	3500	7600	6500
Засталося	?	?	?	?	?

7. Выберы выраз, які з'яўляецца рашэннем задачы. Знайдзі значэнне выразу, калі c роўна 450.

Прывезлі c падручнікаў па матэматыцы, а падручнікаў па беларускай мове ў 3 разы менш. Колькі ўсяго падручнікаў прывезлі?

$c \cdot 3$ $\quad$ $c : 3$ $\quad$ $c + c : 3$ $\quad$ $c + c \cdot 3$

8. Вылічы.

3930 – 2450	5670 + 3486	930 : 30
7754 – 5385	6741 + 3254	560 : 40
8960 – 3675	4619 + 2341	750 : 50

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

9. Рашы задачу.

У двух бітонах было малака пароўну. Малако з першага бітона разлілі ў 8 пяцілітровых збаноў. Малако з другога бітона разлілі ў 4 аднолькавыя вядры. Колькі літраў малака змясцілася ў кожным вядры?

10. Рашы задачу.

Алоўкам, даўжыня якога 15 см, можна правесці лінію даўжынёй 60 км. Лінію якой даўжыні можна правесці, спісаўшы 5 см такога алоўка?

Урок 15

1. Колькі ў ліках усяго тысяч? Усяго дзясяткаў тысяч? Усяго соцень? Усяго дзясяткаў?

52 404 105 007 348 915 900 810

2. Вылічы.

1255 – (639 – 50)	512 : 8 + 673
9789 – (3987 + 4569)	918 : 9 · 3
1344 + (806 + 799)	5456 – 123 · 3

3. Рашы задачу. У адказе выкарыстай слова «чвэрць».

Перадача «Навіны» закончылася ў 20 г 45 мін, а доўжылася паўгадзіны. У колькі гадзін пачалася перадача?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Рашы задачу.

Калі чатыры дзясяткі літраў вады разлілі ў 15 аднолькавых збаноў, засталося 10 л вады. Колькі літраў вады змяшчаецца ў 10 такіх збанах?

5. Рашы задачу.

У трохвугольніка дзве стараны маюць аднолькавую даўжыню. Перыметр трохвугольніка 1600 см, а трэцяя старана — 40 дм. Якая даўжыня дзвюх аднолькавых старон трохвугольніка?

6. Выразі ў кіламетрах і метрах.

23 478 м 123 024 м 23 347 м 90 101 м

Урок 16

1. Вылічы паводле ўзору.

32 000 + 22 000 =
= 32 тыс. + 22 тыс. = 54 тыс. = 54 000

45 000 + 22 000	21 000 – 17 000
48 000 + 31 000	51 000 – 24 000
62 000 + 12 000	32 000 – 16 000

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Вылічы паводле ўзору.

220 000 + 140 000 =
= 22 дзяс. тыс. + 14 дзяс. тыс. = 36 дзяс. тыс. =
= 360 000

260 000 + 320 000	890 000 – 270 000
230 000 + 410 000	520 000 – 340 000
120 000 + 730 000	230 000 – 110 000

3. Рашы ўраўненні.

$x + 445 = 830$	$385 + x = 689$	$329 + x = 600$
$x + 456 = 1000$	$1000 - x = 212$	$x - 978 = 522$

4. Рашы задачу.

Майстар за 3 г работы можа адрамантаваць 18 крэслаў, а вучань майстра за той жа час рамантуе 9 крэслаў. Колькі крэслаў яны могуць адрамантаваць разам за 1 г? За 5 г?

5. Рашы задачу.

Маса 4 пачкаў сметанковага масла 800 г. Знайдзі масу 3 пачкаў бутэрброднага маргарыну, калі маса адного пачка маргарыну на 50 г большая, чым маса аднаго пачка масла.

6. Начарці прамавугольнік, даўжыня адной стараны якога роўна $\frac{1}{4}$ даўжыні другой стараны. Назаві прамавугольнік. Вылічы яго перыметр.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Колькі цяпер часу, калі гадзіннікі спяшаюцца на 15 мін? Выкарыстай, дзе магчыма, словы «палова», «чвэрць».



Урок 17

1. Вылічы паводле ўзору.

32 000 · 2 = 32 тыс. · 2 = 64 тыс. = 64 000
32 000 : 2 = 32 тыс. : 2 = 16 тыс. = 16 000

12 000 · 3	24 000 · 2	43 000 · 2
81 000 : 9	84 000 : 7	51 000 : 3
23 000 · 3	24 000 : 2	96 000 : 4

2. Вылічы паводле ўзору.

220 000 · 4 = 22 дзяс. тыс. · 4 =
= 88 дзяс. тыс. = 880 000
220 000 : 2 = 22 дзяс. тыс. : 2 =
= 11 дзяс. тыс. = 110 000
220 000 : 11 = 22 дзяс. тыс. : 11 =
= 2 дзяс. тыс. = 20 000

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

310 000 · 3	120 000 · 2	410 000 · 2
440 000 : 2	880 000 : 4	660 000 : 2
320 000 · 3	660 000 : 33	960 000 : 16

3. Дапоўні сказы.

900 000 г — гэта больш, чым 100 гадоў.
Значыць, 450 000 г — гэта больш, чым … гадоў.
900 000 крокаў — гэта больш, чым 400 км.
Значыць, … крокаў — гэта больш, чым 200 км.

4. Вылічы.

7000 + 600	8000 + 56	60 000 – 1000
300 000 – 1	100 000 : 5	70 000 + 900 000
14 000 – 7000	240 000 · 4	850 000 – 40 000

5. Дапоўні ўмову з дапамогай схемы. Рашы задачу.

У супермаркеце купілі джэм у слоічках па … г, усяго 600 г. Потым купілі столькі ж слоічкаў з дзіцячым пюрэ, усяго … г. Знайдзі масу аднаго слоічка з дзіцячым пюрэ.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Рашы задачу.

Рыбак да світання выехаў з горада на рыбалку. Адлегласць ад горада да рэчкі 28 км. Калі развіднела, рыбак ужо праехаў чвэрць усяго шляху. Колькі кіламетраў засталося ехаць рыбаку?

7. Каля ўваходу ў паштовае аддзяленне ёсць схема. На ёй зялёным колерам паказана, калі наведвальнікаў асабліва мала, і чырвоным колерам — калі наведвальнікаў асабліва шмат. Як гэта схема можа дапамагчы выбраць зручны час для наведвання пошты?

Урок 18

Разгледзь, як выглядае цыркуль. З дапамогай цыркуля можна параўноўваць даўжыні адрэзкаў і будаваць адрэзкі патрэбнай даўжыні.



1. З дапамогай цыркуля параўнай даўжыні адрэзкаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Начарці прамую. З дапамогай цыркуля пабудуй на ёй адрэзак *AB*, даўжыня якога 3 см, і адрэзак *BC* такой жа даўжыні.

3. Вылічы.

386 + 526 – 648 4890 – 2715 + 3413
34 000 + 12 000 450 000 – 210 000

4. Параўнай.

35 639 ☐ 45 401 37 332 ☐ 37 210
53 322 ☐ 52 895 831 040 ☐ 842 000

5. Рашы ўраўненні.

$356 + a = 702$ $c \cdot 4 = 68\,000$ $3 \cdot b = 180\,000$

6. Рашы задачу, ведаючы, што поўнач — гэта пачатак сутак.

Цягнік выехаў з Мінска ў Маскву ў поўнач. У колькі гадзін цягнік прыехаў у Маскву, калі ён быў у дарозе 10 г 30 мін?

7. Рашы задачу, ведаючы, што поўдзень — гэта палова сутак.

У поўдзень Толя і Вася прыйшлі са школы і праз 2 г 15 мін пайшлі разам на прагулку. У колькі гадзін Толя і Вася пайшлі на прагулку?

8. Рашы задачу.

Кацінаму дзядулю 60 гадоў. Ён у 2 разы старэйшы за Кацінага тату. У колькі разоў Каця маладзейшая за свайго тату, калі ёй 10 гадоў?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

9. Рашы задачу.

Турысты хочуць наведаць горад Заслаўе і вёску Дудуткі. Адлегласць ад Мінска да Заслаўя складае пятую частку ад сотні кіламетраў. Знайдзі адлегласць ад Мінска да Дудутак, калі вядома, што яна ў 2 разы большая, чым адлегласць ад Мінска да Заслаўя.

Урок 19

З дапамогай цыркуля параўнай адлегласці ад пункта *O* да пунктаў *A* і *B* на двух малюнках. На якім малюнку пункты *A* і *B* знаходзяцца на аднолькавай адлегласці ад пункта *O*?





На малюнку 2 паказана акружнасць. Акружнасць — гэта *мяжа* вядомай табе фігуры — *круга*.
Пункт *O* — гэта цэнтр акружнасці (круга). Адрэзак, які злучае пункт *O* з любым пунктам акружнасці, — гэта радыус акружнасці (круга).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. З дапамогай цыркуля параўнай даўжыні радыусаў акружнасцей.



2. Начарці акружнасць, радыус якой 2 см, з дапамогай цыркуля. Працуй па ўзоры.



Абазнач літарай *O* цэнтр акружнасці — пункт, у якім было вастрыё цыркуля. Начарці радыус акружнасці — адрэзак, які злучае пункт *O* з любым пунктам акружнасці.

3. Вылічы.

34 000 : 2 + 6000 72 000 – (37 000 + 18 000)
720 000 : 8 · 2 42 000 – 22 000 : 11

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Складзі выразы, знайдзі іх значэнні.

- Суму лікаў 58 і 107 павялічыць у 4 разы.
- Да 5856 дадаць здабытак лікаў 107 і 6.
- Здабытак лікаў 58 і 4 павялічыць на 564.

5. Рашы задачу.

На складзе было 60 ц грузу. Спачатку вывезлі $\frac{1}{4}$ частку грузу, а потым — яшчэ 15 ц. Колькі цэнтнераў грузу вывезлі? Колькі засталося вывезці?

6. Рашы задачу.

За 5 г станок-аўтамат можа зрабіць 350 дэталей. За які час гэты станок можа зрабіць 560 дэталей?

7. Колькі адрэзкаў? Колькі прамянёў?



8. Пастаў знакі дзеянняў і дужкі так, каб атрымаліся правільныя роўнасці.

2 2 2 2 = 48 2 2 2 2 2 = 20

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Было 9 пакетаў цукру. Для прыгатавання клубнічнага варэння выкарысталі адну трэцюю частку пакетаў, а для прыгатавання малінавага варэння — дзве трэціх часткі пакетаў.



Запомні!

У запісах выгляду $\frac{1}{2}$, $\frac{2}{3}$, $\frac{3}{5}$ лік, які запісаны пад рысай, абазначае, на колькі роўных частак падзялілі; лік, які запісаны над рысай, абазначае, колькі такіх частак узялі.

1. Рашы задачу.

На талерцы 10 вішань. Ваня ўзяў $\frac{3}{5}$ часткі вішань. Колькі вішань узяў Ваня?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Спачатку даведаюся, колькі вішань у адной пятай частцы. Для гэтага 10 падзялю на 5, атрымліваю 2.
Потым даведаюся, колькі вішань у трох пятых частках. Для гэтага 2 памножу на 3, атрымліваю 6.

2. Пабудуй схему. Рашы задачу.

Ад Брэста да Гродна каля 200 км. Колькі кіламетраў складае $\frac{1}{4}$ частка гэтай адлегласці? $\frac{2}{4}$ часткі гэтай адлегласці? $\frac{3}{4}$ часткі?

3. Выберы схему. Рашы задачу.

Для ўкладкі дарожак выкарысталі 4000 шэрых і чырвоных тратуарных плітак. Шэрых плітак было ў 3 разы больш, чым чырвоных. Колькі шэрых і колькі чырвоных тратуарных плітак выкарысталі?





4. Вылічы.

684 : 3 – 648 : 4 (960 – 69) : 9
386 – 36 · 2 450 + 316 – 214
253 – 6 + 253 – 4 330 · 3 – 168 : 21

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Выразі ў большых адзінках вымярэння.

2000 м 240 мм 840 дм 3000 г 560 ц

6. Вылічы.

340 000 + 230 000 78 000 – 34 000
35 000 · 2 96 000 : 4
120 000 · 3 96 000 : 16

7. Радыус акружнасці з цэнтрам у пункце *М* — 6 см. Ён у 2 разы большы, чым радыус акружнасці з цэнтрам у пункце *О*. Начарці акружнасць з цэнтрам у пункце *О*.

8. Праз паўгода наступіць лістапад. Які месяц цяпер? Які месяц наступіць праз чвэрць года?

Урок 21

1. Вылічы паводле ўзору.

15 000 : 5000 = 15 тыс. : 5 тыс. = 3
150 000 : 50 000 = 15 дзяс. тыс. : 5 дзяс. тыс. = 3

900 : 300 800 : 200 270 : 30
9000 : 3000 8000 : 2000 2700 : 300
90 000 : 30 000 80 000 : 20 000 27 000 : 3000

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Вылічы.

(163 + 719) – (800 – 651)
(282 + 459) – (500 – 261)
(582 – 354) – (741 – 699)

736 – 417 + 167
1 · 294 + (789 – 265)
230 · 0 + (814 – 795)

3. Вылічы.

350 000 – 40 000
120 000 + 760 000
1 000 000 – 250 000

2400 · 3 : 2
78 000 : 3 · 2
3900 : 300 · 0

4. Упішы патрэбныя лічбы.

$$\begin{array}{r} 65\square7 \\ +\ 153\square \\ \square542 \\ \hline \square3\square42 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 3\square4 \\ \times\ \ \square \\ \hline 1\square70 \end{array} \qquad \begin{array}{r|l} \square\square2 & 8 \\ \cline{2-2} -\ \square\square & 6\square \\ \cline{1-1} 3\square & \\ -\ \square\square & \\ \cline{1-1} 0 & \end{array}$$

5. Рашы задачу.

На будоўлю трэба прывезці 180 т цэменту. Першы самазвал можа прывезці гэты груз за 20 рэйсаў, а другі самазвал — за 30 рэйсаў. Колькі тон грузу могуць прывезці за 1 рэйс гэтыя самазвалы, працуючы разам? Колькі тон грузу яны могуць прывезці за 2 рэйсы?

6. Рашы задачу.

Маса кавуна 4000 г. Знайдзі масу двух пятых частак гэтага кавуна.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Складзі і рашы задачу.



8. Разгледзь, як з дапамогай цыркуля на прамой паслядоўна пабудавалі адрэзкі, роўныя даўжыням звёнаў ломанай. Знайдзі даўжыню ломанай з дапамогай лінейкі.



Урок 22

1. Павяліч кожны лік на адну тысячу. Павяліч кожны лік на сто. Паменшы кожны лік на дзве тысячы.

456 789 | 12 456 | 789 000 | 307 567

2. Вылічы.

109 – 245 : 7	1821 + (51 : 17)	18 000 : 6
172 + 132 · 6	3840 – (30 · 4)	18 000 : 6000

3. Параўнай.

35 дм 7 см ☐ 3 м 57 см 4 м 8 дм ☐ 48 дм
3 м 52 см ☐ 35 дм 2400 см ☐ 24 дм

4. Якія значэнні літары падыходзяць?

23 000 > a 70 700 > b 34 567 < c

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Рашы задачу.

Маса двух пачкаў масла роўна масе аднаго пачка масла і двух плаўленых сыркоў. Маса пачка масла 400 г. Знайдзі масу пачка плаўленага сырка.

6. Складзі і рашы задачу.

	Расход тканіны на 1 выраб, м	Колькасць вырабаў, шт.	Увесь расход тканіны, м
Сукенкі	4	120	аднолькавы
Плашчы	6	?	

7. Рашы задачу.

Веласіпедысту трэба праехаць 60 км. Тры пятых часткі гэтай адлегласці ён ужо праехаў. Колькі кіламетраў засталося праехаць веласіпедысту?

8. На лісце паперы пабудуй акружнасць з радыусам 25 мм. Выражы акружнасць. У цябе атрымаўся круг. Правядзі на ім адрэзак так, каб ён падзяліў круг на 2 роўныя часткі.

9. Рашы задачу.

Плошча квадрата 16 см^2. Даўжыню стараны гэтага квадрата павялічылі ў 2 разы. Знайдзі плошчу новага квадрата.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

СКЛАДАННЕ І АДНІМАННЕ МНАГАЗНАЧНЫХ ЛІКАЎ

Урок 23

Растлумач, не вылічваючы, чаму роўнасці правільныя.

2 + 60 000 = 60 000 + 2

Успомні ***перамяшчальную*** *ўласцівасць складання:*
ад перамены месцаў складаемых
сума не мяняецца.

Растлумач, не вылічваючы, чаму роўнасці правільныя.

60 000 + 520 + 2 = (60 000 + 520) + 2 =

= 60 000 + (520 + 2)

Успомні ***спалучальную*** *ўласцівасць складання:*
пры складанні два суседніх складаемых
можна замяніць іх сумай.

Ведаючы гэтыя ЎЛАСЦІВАСЦІ складання, можна выконваць вылічэнні рознымі спосабамі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Вылічы рознымі спосабамі. Выкарыстай перамяшчальную і спалучальную ўласцівасці складання.

30 000 + 60 000 + 700 50 000 + 10 + 90 + 200

10 + 600 000 + 100 000 80 + 400 + 20 + 600

2. Выразі ў міліметрах.

12 см 1 дм 5 см 2 дм 3 см 6 мм

3. Складзі і рашы ўраўненні.

- Невядомы лік падзялілі на 6 і атрымалі 509.
- Да 342 дадалі невядомы лік і атрымалі 900.
- Невядомы лік павялічылі ў 5 разоў і атрымалі 45 000.

4. Рашы задачу.

Плошча старонкі кнігі 648 см^2. Плошча старонкі блакнота складае $\frac{2}{3}$ часткі плошчы старонкі кнігі. На колькі квадратных сантыметраў плошча старонкі блакнота меншая, чым плошча старонкі кнігі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Рашы задачу.

Аўтамабіль адправіўся ў дарогу ў 9 г. Ён ехаў без прыпынку 3 г 20 мін, а потым спыніўся на трэць гадзіны і зноў адправіўся ў дарогу. У колькі гадзін аўтамабіль зноў адправіўся ў дарогу?

6. Рашы задачу.

Да абеду ў магазіне была прададзена палова ўсёй мукі, а пасля абеду — астатнія 20 пачкаў, па 2 кг мукі ў кожным. Колькі мукі было ў магазіне?

7. Начарці прамую. Абазнач на ёй пункты *A*, *M*, *N* так, каб:

а) *AM* = 7 см, *MN* = 2 см 5 мм, *AN* = 9 см 5 мм;
б) *AM* = 3 см, *MN* = 5 см 5 мм, *AN* = 2 см 5 мм;
в) *AM* = 10 см, *MN* = 8 см, *AN* = 2 см.

8. Параўнай выразы. Здагадайся, не вылічваючы, які з іх мае найбольшае значэнне, а які — найменшае. Правер вылічэннем.

840 : 7 – 5 – 20	840 : 7 – 20 – 5
840 : (7 – 5) – 20	840 : 7 – 20 – 50

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Параўнай вылічэнні. Растлумач.

$$\begin{array}{r} 3267 \\ +\ 2431 \\ \hline 5698 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 543267 \\ +\ 132431 \\ \hline 675698 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 4569 \\ -\ 2143 \\ \hline 2426 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 874569 \\ -\ 532143 \\ \hline 342426 \end{array}$$

Каб выканаць складанне (або адніманне) многазначных лікаў, спачатку запішу іх у слупок, размясціўшы аднолькавыя разрады адзін пад адным.
Потым выканаю складанне (або адніманне) паразрадна, пачынаючы з разраду адзінак першага класа.

1. Вылічы ў слупок.

45 624 + 22 231 18 025 + 51 273
766 999 – 530 873 798 549 – 264 318

2. Выразі ў сантыметрах.

5 м 15 см	17 дм 8 см	6 м 9 дм
8 м 7 см	15 дм 7 см	8 м 6 дм
1 м 11 см	22 дм 3 см	2 м 34 дм

3. Рашы ўраўненні.

x + 46 000 = 90 000 y · 3000 = 24 000
a – 160 000 = 190 000 7200 : c = 6

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Рашы задачу.

Груз масай 13 576 кг вывезлі трыма самазваламі. На трэцім самазвале вывезлі 3250 кг грузу. На другім самазвале вывезлі на 1 т больш, чым на першым. Якую масу грузу вывезлі на першым самазвале?

5. Растлумач, што абазначаюць выразы.

У першы дзень прадалі a кг яблыкаў, у другі дзень — на 250 кг больш, чым у першы, а ў трэці дзень — у 2 разы больш, чым у першы.

$a + 250$ $\quad a \cdot 2$ $\quad a + a \cdot 2$ $\quad a + (a + 250)$

6. Складзі і рашы задачу.



7. Начарці акружнасць з радыусам 2 см. З дапамогай цыркуля паводле ўзору адзнач паслядоўна на акружнасці пункты, адлегласць паміж якімі роўна радыусу акружнасці. Злучы пункты. Якая фігура атрымалася?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Параўнай вылічэнні. Растлумач.

$$\begin{array}{r} 2385 \\ +\ 2415 \\ \hline 4800 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 642\,385 \\ +\ 162\,415 \\ \hline 804\,800 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 5600 \\ -\ 3287 \\ \hline 2313 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 505\,600 \\ -\ 333\,287 \\ \hline 172\,313 \end{array}$$

1. Вылічы ў слупок.

6524 + 2246 59 129 + 21 731
7642 + 1128 876 465 + 123 335
8700 – 4563 480 600 – 56 478

2. Вылічы.

13 + 4000 + 87 56 000 : 7
12 000 – (6000 – 6000) 300 + 7000
(100 000 – 2000) : 2 2 · (30 000 – 1)

3. Вылічы.

3 м 16 см + 6 м 8 дм 8 м 4 дм : 2
2 м 3 дм 2 см – 2 дм 2 см 16 дм 24 см : 8

4. Рашы задачу.

Каб разліць 920 л соку, спатрэбілася 460 аднолькавых пакетаў. Колькі такіх пакетаў трэба, каб разліць 380 л соку?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Рашы задачу.

Глыбіня самага вялікага возера Беларусі — Нарачы — каля 24 м, а даўжыня яго берагавой лініі — 41 км. На колькі метраў даўжыня берагавой лініі возера большая, чым яго глыбіня?

6. Дапоўні схему лікавымі данымі. Рашы задачу.

За тры дні аўтамабіль праехаў 1550 км. У другі дзень ён праехаў на 250 км больш, чым у першы, а ў трэці дзень — на 150 км больш, чым у другі. Колькі кіламетраў праехаў аўтамабіль у першы дзень?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Выкажы здагадку, на якіх малюнках вяршыні многавугольнікаў размешчаны на аднолькавай адлегласці ад пункта *О*. Правер з дапамогай цыркуля.



Урок 26

Параўнай вылічэнні. Растлумач.

$$\begin{array}{r} 5367 \\ +\ 3876 \\ \hline 9243 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 785367 \\ +\ 123876 \\ \hline 909243 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 5623 \\ -\ 1987 \\ \hline 3636 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 305623 \\ -\ 141987 \\ \hline 163636 \end{array}$$

1. Вылічы ў слупок.

341 279 + 537 191 646 208 – 254 277
321 098 + 16 093 845 152 – 76 304

2. Устаў патрэбныя лічбы.

$$\begin{array}{r} \square\,8\,\square\,5 \\ +\ 1\,5\,3\,\square \\ \hline 3\,\square\,7\,2 \end{array} \qquad \begin{array}{r} \square\,\square\,8 \\ \times\ \ \ \ 7 \\ \hline 1\,\square\,6\,\square \end{array} \qquad \begin{array}{r|l} 4\,\square\,2 & 6 \\ \square\,\square\ \ & 6\,\square \\ \hline -\ 4\,\square & \\ \square\,\square & \\ \hline 0 & \end{array}$$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Рашы задачу.

У майстэрні было 960 м тканіны. На сукенкі пайшло $\frac{2}{3}$ часткі гэтай тканіны, па 4 м на кожную сукенку. Колькі сукенак пашылі?

4. Дапоўні задачу лікавымі данымі дыяграмы. Рашы задачу.

У першай спартыўнай секцыі ... хлопчыкаў і ... дзяўчынак, а ў другой — ... хлопчыкаў і ... дзяўчынак. Для спартыўных спаборніцтваў усе дзеці разбіліся на каманды, па 11 чалавек у кожнай. Колькі атрымалася каманд?



5. Рашы задачу.

Знайдзі перыметр і плошчу прамавугольніка з даўжынямі старон 152 см і 8 см.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Пабудуй на лісце паперы акружнасць з радыусам 30 мм. Выражы акружнасць. У цябе атрымаўся круг. Правядзі на ім 2 адрэзкі так, каб падзяліць круг на 4 роўныя часткі.

Урок 27

1. Вылічы.

465 476 + 239 187
151 034 + 28 489
39 567 + 24 678

846 208 – 254 786
786 152 – 76 456
467 899 – 342 678

2. Запішы лікі. Параўнай.

- Трыста тысяч пяцьсот трынаццаць і трыста адна тысяча.
- Пяцьдзясят дзевяць тысяч семдзесят і пяцьсот тысяч трыста восемдзесят.
- Дваццаць тры тысячы сем і пяцьсот тысяч шаснаццаць.
- Сто дзесяць тысяч і тысяча дзесяць.

3. Вылічы.

(120 · 4) + 9 + 9 – 2
(190 · 3) – (35 – 9)
3 · (23 + 56) – 5
(120 · 4) – (150 – 70)

71 – 34 + 28 – 5
59 – (31 + 18 – 2)
(120 · 4) – (470 – 397)
6300 : 3 · 2

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Параўнай.

3 т ☐ 300 ц

456 ц ☐ 5 т

2 ц ☐ 65 кг

$\frac{1}{2}$ сут. ☐ 2 г

$\frac{1}{4}$ г ☐ 20 мін

$\frac{1}{2}$ мін ☐ 30 с

5. Рашы задачу.

Адлегласць паміж двума гарадамі 560 км. Тры восьмых часткі гэтай адлегласці аўтамабіль ехаў павольна, а астатнюю частку — хутка. Колькі кіламетраў аўтамабіль ехаў хутка?

6. Рашы задачу. Якія гадзіннікі паказваюць, у колькі гадзін госці прыйшлі і пайшлі?

Госці прыйшлі да Вані на дзень нараджэння ў 15 г 30 мін, а пайшлі праз 3 г. У колькі гадзін пайшлі госці?



7. Начарці акружнасць з радыусам 25 мм. Абазнач літарай *O* цэнтр акружнасці. Адзнач пункты *A* і *B* на акружнасці і пункты *C* і *D* унутры акружнасці.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

8. Да ліку 60 справа прыпісалі лічбу 6. На колькі павялічыўся лік? На колькі ён павялічыцца, калі прыпісаць да яго лічбу 6 злева?

Урок 28

1. Вылічы.

528 047 + 106 875 320 260 – 221 476
385 746 + 123 352 605 209 – 353 672

2. Складзі выразы і знайдзі іх значэнні.

- Суму лікаў 8746 і 3028 паменшыць на 5236.
- Рознасць лікаў 32 482 і 6002 павялічыць на 21 396.

3. Запоўні пропускі ў наступных сказах.

У адным дзясятку 10 ... .
У адной сотні 10 ... .
У адной тысячы 10 ... .
У адным дзясятку тысяч 10 ... .
У адной сотні тысяч ... дзясяткаў тысяч.
У адным мільёне ... соцень тысяч.

4. Рашы задачу.

Сабралі 125 кг буракоў, што на 350 кг менш, чым бульбы. Чатыры восьмых часткі сабранай гародніны звезлі. Колькі кілаграмаў гародніны звезлі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Рашы задачу.

Рыбакі лавілі па 75 ц рыбы ў дзень з панядзелка па чацвер. Колькі дзён ім давялося б лавіць такую ж колькасць рыбы, калі б штодзённы ўлоў складаў 100 ц?

6. Складзі і рашы задачу.



Урок 29

За 1 г пешаход прайшоў 5 км. Колькі кіламетраў ён пройдзе за 2 г, калі будзе рухацца гэтак жа: ні хутчэй, ні павольней?



5 км · 2 = 10 км

Шлях, пройдзены за ўвесь час руху, называюць адлегласцю.
Адлегласць, пройдзеную за адзінку часу пры раўнамерным руху, называюць скорасцю.

Адлегласць вымяраецца ў адзінках даўжыні: кіламетр (км), метр (м), дэцыметр (дм), сантыметр (см), міліметр (мм).
Скорасць вымяраецца ў адзінках скорасці: кіламетр у гадзіну (км/г), метр у мінуту (м/мін), кіламетр у мінуту (км/мін).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Рашы задачу.



Ад вёскі *A* да вёскі *B* веласіпедыст ехаў 3 г са скорасцю 15 км/г. Знайдзі адлегласць ад вёскі *A* да вёскі *B*.

Скорасць, км/г	Час, г	Адлегласць, км
15	3	?

Каб вызначыць *адлегласць*, трэба скорасць руху памножыць на час руху.

2. Пабудуй схему. Рашы задачу.

Маша ідзе ў школу са скорасцю 50 м/мін. На шлях ад дома да школы яна траціць 5 мін. Якая адлегласць ад дома да школы?

3. Рашы задачу.

Маса вугалю ў вагоне 64 т. Самазвал за адзін рэйс можа вывезці $\frac{2}{8}$ часткі гэтага вугалю. Колькі рэйсаў трэба зрабіць самазвалу, каб вывезці ўвесь вугаль?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Рашы задачу.

Даўжыня ракі Заходняя Дзвіна — 1020 км. Гэта рака цячэ па тэрыторыі Расіі, Беларусі, Латвіі. Частка Дзвіны ў Расіі складае 325 км, што на 42 км менш, чым у Латвіі. Якая даўжыня часткі Дзвіны ў Беларусі?

5. Вылічы.

40 708 – 3 + 625	64 + 36 : 4	237 : 3
80 506 + 73 560	75 – 18 · 2	714 : 6
96 034 – 86 326	80 – 64 : 2	936 : 4

6. Рашы ўраўненні.

$x + 234 = 735$	$a - 306 = 714$	$120 \cdot k = 600$
$124 + x = 709$	$986 - a = 442$	$k : 7 = 1300$

7. Начарці ў сшытку прамую і пабудуй на ёй з дапамогай цыркуля адрэзак, даўжыня якога ў 5 разоў большая, чым даўжыня адрэзка *AB*. Правер з дапамогай лінейкі правільнасць пабудовы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Пабудуй схему. Рашы задачу.

Адлегласць 320 км цягнік прайшоў за 4 г. З якой скорасцю ішоў цягнік?

Скорасць, км/г	Час, г	Адлегласць, км
?	4	320

Каб вызначыць *скорасць руху*, трэба адлегласць падзяліць на час руху.

2. Пабудуй схему. Рашы задачу.

Скорасць матацыкліста 40 км/г. За які час ён зможа праехаць 120 км?

Скорасць, км/г	Час, г	Адлегласць, км
40	?	120

Каб вызначыць *час руху*, трэба адлегласць падзяліць на скорасць руху.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Пабудуй схему. Рашы задачу. Складзі дзве адваротныя задачы.

Света ідзе з дому ў музычную школу 9 мін са скорасцю 80 м/мін. Знайдзі адлегласць ад яе дома да музычнай школы.

Скорасць, м/мін	Час, мін	Адлегласць, м
80	9	?
?	☐	☐
☐	?	☐

4. Рашы задачу.

Хлопчыкі хочуць запісаць на дыск 5 мультфільмаў, якія доўжацца 15 мін, 48 мін, 22 мін, 10 мін, 55 мін. Ці змесцяцца ўсе мультфільмы на дыск, калі на ім засталося свабоднага месца на 2 г?

5. Вылічы.

7000 – 395 100 000 – 3619
9009 – 456 60 500 – 32 089
35 005 – 174 400 000 – 2563

6. Запішы лікі. Параўнай.

2 сот. ☐ 20 дзяс. 12 дзяс. 7 адз. ☐ 13 тыс. 5 соц.
14 соц. ☐ 12 дзяс. 85 дзяс. тыс. 5 соц. ☐ 85 тыс.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Нядзеля наступіць праз 3 дні. Які дзень тыдня сёння? Які дзень тыдня быў учора?

Урок 31

Якая даўжыня стараны квадрата? Выразі ў дэцыметрах; сантыметрах.

Запомні!

Плошча квадрата са стараной 1 дм роўна аднаму квадратнаму дэцыметру (1 дм^2). Квадратны дэцыметр — гэта адзінка плошчы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Колькі квадратных сантыметраў размяшчаецца ў адным радзе ўздоўж стараны квадрата плошчай 1 дм^2? Колькі такіх радоў?
Колькі ўсяго квадратных сантыметраў размяшчаецца на паверхні квадрата плошчай 1 дм^2?

1 дм^2 = 100 см^2

2. Рашы задачу.

Плошча ліста фанеры 357 дм^2. Спачатку майстар адпіліў трэць гэтага ліста, а потым палову астатку. Колькі квадратных дэцыметраў ліста фанеры пасля гэтага засталося?

3. Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

Верталёт ляціць са скорасцю 350 км/г. Якую адлегласць ён праляціць за 4 г?

4. Выразі ў большых адзінках вымярэння.

48 г	480 с	40 000 мм
300 ц	2000 г	240 мін

5. Вылічы.

410 – 386	234 567 + 4598	24 000 : 6
236 + 174	73 685 – 12 597	24 000 : 6000
510 – 348	234 235 – 345	2400 : 600

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



6. Начарці акружнасць з радыусам 2 см. Абазнач цэнтр акружнасці пунктам *O*. Правядзі адрэзак праз пункт *O* паводле ўзору. Вымерай даўжыню гэтага адрэзка. Параўнай яе з даўжынёй радыуса акружнасці.

Урок 32

Для выканання арыфметычных дзеянняў зручна карыстацца калькулятарам.

Для таго каб выканаць вылічэнні на калькулятары, неабходна:

увесці з дапамогай кнопак з лічбамі патрэбны лік. Гэты лік з'явіцца на экране калькулятара;

націснуць кнопку са знакам арыфметычнага дзеяння, якое трэба выканаць:

[+] складанне, [×] множанне,

[–] адніманне, [÷] дзяленне;

увесці з дапамогай кнопак з лічбамі другі лік;

націснуць кнопку са знакам «роўна»: [=];

прачытаць лік, які з'явіўся на экране, — гэта і ёсць вынік выканання дзеяння.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Вылічы. Выканай праверку з дапамогай калькулятара.

476 186 + 108 456	708 107 – 387	56 000 : 7
567 309 + 23 739	90 562 – 43 576	23 000 · 4

2. Знайдзі выразы з аднолькавым значэннем. Правер сябе з дапамогай калькулятара.

870 : 30	750 : 5	930 – 640
610 – 460	480 : 4	567 – 543

3. Выберы схему. Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

Турысты за 5 г прайшлі 30 км. З якой скорасцю ішлі турысты?



4. Рашы задачу.

На выраб 8 пар аднолькавага абутку трэба 32 дм^2 скуры. Колькі квадратных дэцыметраў скуры спатрэбіцца, каб пашыць у 2 разы менш пар такога абутку?

5. Перыметр трохвугольніка 167 см. Даўжыні кожнай з дзвюх яго старон роўныя 56 см. Ці будуць роўныя даўжыні ўсіх трох старон трохвугольніка?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Дапоўні сказы.

Мама купіла 200 ... цукерак.
У вядры змяшчаецца 5 ... вады.
Коля цяжэйшы за сваю сястру на 5 ... .
Марына маладзейшая за сваю сястру на 8 ... .
Даўжыня запалкі 4 ... .
Вышыня дрэва каля 13 ... .

Ліпень

пн	аўт	ср	чц	пт	сб	ндз
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30	31				

7. У бабулі Веры 3 унучкі. Таня адпачывала ў бабулі з 1 па 15 ліпеня, Каця — з 5 па 21 ліпеня, а Марына — з 10 па 30 ліпеня. Колькі дзён дзяўчынкі былі разам у бабулі?

Урокі 33—35

1. Рашы задачу.

Для падключэння 5 тэлевізараў патрабуецца 15 м электрычнага шнура, пароўну на кожны тэлевізар. Ці хопіць 400 м электрычнага шнура, каб падключыць 134 тэлевізары?

2. Рашы задачу двума спосабамі.

У магазіне было 50 двухлітровых слоікаў з яблычным сокам і столькі ж трохлітровых слоікаў з таматным сокам. Якога соку было больш? На колькі літраў больш?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Рашы задачу.

Заапарк за адзін дзень наведалі 375 чалавек. Сярод іх было 226 дарослых, а школьнікаў — у 2 разы менш, чым дарослых. Астатнія наведвальнікі — гэта дашкольнікі. Колькі ўсяго дзяцей наведала заапарк?

4. Рашы задачу.

З шоўку пашылі 25 сарафанаў, расходуючы па 3 м тканіны на кожны. Колькі сукенак можна пашыць з такога ж кавалка шоўку, калі на кожную сукенку ідзе 5 м тканіны?

5. Рашы задачу.

Бяроза жыве 250 гадоў. Гэта складае $\frac{1}{4}$ частку працягласці жыцця дуба. На колькі гадоў даўжэй жыве дуб, чым бяроза?

6. Рашы задачу.

Для дзіцячага сада купілі 5 скрынь яблыкаў, па 24 кг у кожным. З двух шостых частак яблыкаў зварылі кампот, а астатнія яблыкі раздалі дзецям на падвячорак. Колькі кілаграмаў яблыкаў раздалі дзецям?

7. Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

За 8 г цеплаход прайшоў 320 км. З якой скорасцю рухаўся цеплаход?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

8. Складзі і рашы задачы.





9. Рашы задачу.

Смоўж рухаецца са скорасцю 6 см/мін. Колькі сантыметраў прапаўзе смоўж за 1 г?

10. Выберы транспартны сродак, які можа рухацца з абазначанай на схеме скорасцю. Складзі і рашы задачу.





11. Вылічы.

15 000 · 6	18 000 · 4	1800 · 4
9000 · 7	170 000 · 3	4500 · 2

12. Вылічы.

245 830 + 15 692	639 204 + 290 456
97 800 + 243 608	930 567 + 298
403 789 + 200 098	124 008 + 274 899

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

13. Вылічы.

940 786 – 123 499 478 009 – 23 786
129 000 – 99 678 836 006 – 237 974
45 097 – 8219 299 407 – 98 400

14. Вылічы.

5600 : 7 9600 : 6 51 000 : 3000
15 000 : 5 20 100 : 1 4800 : 600
900 000 : 3 4200 : 3 73 000 : 1000

15. Знайдзі значэнні здабыткаў.

427 · 3 643 · 5 934 · 8 328 · 4 583 · 6

16. Параўнай, не вылічваючы.

306 · 4 ☐ 306 · 7 30 000 – 8 ☐ 29 000 – 7
208 · 9 ☐ 280 · 9 36 000 : 6 ☐ 360 000 : 6

17. Параўнай.

1 м ☐ 500 см 4 дм ☐ 40 см 400 см^2 ☐ 4 дм^2
8 см ☐ 800 мм 400 мм ☐ 2 м 100 мм ☐ 8 м
3 г ☐ 2 кг 8 см ☐ 80 см 60 кг ☐ 3 ц

18. Знайдзі перыметр і плошчу прамавугольніка з даўжынямі старон 8 дм і 13 дм.

19. Перыметр квадрата 20 см. Начарці прамавугольнік з такім жа перыметрам.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

20. Начарці прамую. З дапамогай цыркуля пабудуй на ёй адрэзак, даўжыня якога ў 4 разы большая, чым даўжыня адрэзка *KL*.

21. Начарці акружнасць, радыус якой 3 см. Абазнач цэнтр акружнасці пунктам *O*. Пастаў пункт *A* на акружнасці, пункт *C* унутры акружнасці, пункт *D* па-за акружнасцю.

22. Вымерай радыусы акружнасцей. Начарці акружнасці так, як паказана на малюнку.



23. Гадзіннікі спазняюцца на 20 мін. Колькі цяпер часу?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

24. Начарці квадрат і акружнасць так, як паказана на малюнку. Як ты лічыш, ці можна так правесці акружнасць вакол любога квадрата?



25. Здагадайся, колькі часу паказваюць гадзіннікі? На якіх цыферблатах вугал паміж гадзіннай і мінутнай стрэлкамі прамы?



26. Вася выконваў арыфметычныя дзеянні на калькулятары. Значэнні якіх выразаў ён ужо знайшоў?

84 000 : 6	57 000 : 3	234 786 + 123 902
6400 : 4	2000 · 4	892 546 – 34 901

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Разгледзь схему. Рашы задачу.

Аўтобус з турыстамі ехаў з Мінска ў Брэст 5 г са скорасцю 90 км/г, а потым з Брэста ў Гродна 3 г са скорасцю 85 км/г. Якую адлегласць праехаў аўтобус?

2. Рашы задачу.

У адным баку на 12 л вады больш, чым у другім. У абодва бакі далілі па 10 л вады. У якім баку стала вады больш і на колькі літраў больш?

3. Рашы задачу.

Пашылі 25 плашчоў, расходуючы па 4 м тканіны на кожны плашч. Колькі плашчоў можна пашыць з такой жа колькасці тканіны, калі расходаваць па 5 м тканіны на кожны плашч?

4. Начарці трохвугольнік паводле ўзору. Параўнай даўжыні яго старон.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Дапоўні ўмову задачы данымі з табліцы. Рашы задачу.

З горада *А* ў горад *В* сям'я паехала па шашы на аўтамабілі, а з горада *В* у горад *С* на цеплаходзе па рацэ. Якая адлегласць была карацейшая? На колькі кіламетраў карацейшая?

Від транспарту	Скорасць руху	Час руху
	200 м/мін	2 мін
	90 км/г	3 г
	40 км/г	6 г
	15 км/мін	5 мін
	250 км/г	4 г

6. У колькі разоў адзін лік большы, чым другі?

10 і 100
9100 і 91
40 і 4000
200 і 20

2000 і 20 000
83 і 830
500 000 і 5000
4000 і 40 000

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Запоўні табліцу. Выканай праверку з дапамогай калькулятара.

Складаемае	257	3819	10 476	56 894	13 081
Складаемае	567	8616	7939	3908	18 600
Сума	?	?	?	?	?

8. Складзі выразы і знайдзі іх значэнні.

- Да ліку 50 700 дадаць рознасць лікаў 2340 і 140.
- Ад рознасці лікаў 4900 і 319 адняць 3947.
- Да здабытку лікаў 173 і 5 дадаць 20 695.

9. Колькі трохзначных лікаў можна саставіць з лічбаў 1, 4, 5, калі лічбы ў ліках не паўтараюцца?

Урок 37

1. Рашы ўраўненні. Выканай праверку з дапамогай калькулятара.

$x + 34\,746 = 243\,908$ $\qquad$ $x - 4667 = 34\,609$

$k + 39\,064 = 52\,300$ $\qquad$ $8034 - k = 520$

$9642 + a = 60\,000$ $\qquad$ $a - 429 = 60\,409$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Прадстаў лікі ў выглядзе сумы разрадных складаемых.

749 800 | 100 385 | 109 609 | 385 487 | 98 006

3. Рашы задачу.

Слон ішоў са скорасцю 100 м/мін. Спачатку ён 3 мін ішоў да ракі, а потым 5 мін ішоў у зваротным напрамку з той жа скорасцю. Які шлях быў даўжэйшы? На колькі метраў даўжэйшы?

4. Рашы задачу.

Прайшла $\frac{1}{3}$ частка 2012 года. Колькі дзён прайшло, калі гэты год высакосны?

5. Рашы задачу.

У 12 аднолькавых пакетаў рассыпалі 60 кг абрыкосаў. Колькі такіх пакетаў трэба, каб рассыпаць 45 кг абрыкосаў?

6. Рашы задачу.

Перыметр чатырохвугольніка 18 см. Даўжыні кожнай з дзвюх яго старон роўныя 3 см, а даўжыня трэцяй стараны роўна суме даўжынь гэтых дзвюх старон. Якая даўжыня чацвёртай стараны?

Ці можа такі чатырохвугольнік быць прамавугольнікам? Не прамавугольнікам?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Радыус якой акружнасці роўны 15 мм?



8. Дапоўні сказы.

Я нарадзіўся ў … годзе, … чысла, … месяца.
Мне … гадоў.
Праз … месяцаў мне споўніцца … гадоў.
Мой бацька нарадзіўся … чысла, … месяца.
Майму бацьку … гадоў.
Мой бацька старэйшы за мяне на … гадоў.
Мая маці нарадзілася … чысла, … месяца.
Маёй маці … гадоў.
Мая маці старэйшая за мяне на … гадоў.
Маці … за бацьку на … гадоў.

Урок 38

1. Складзі і рашы ўраўненні.

Складаемае	a	10 434	91 731	d
Складаемае	48 509	b	c	111 645
Сума	123 543	19 603	567 301	956 008

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Складзі і рашы ўраўненні.

- Ад ліку 114 904 аднялі невядомы лік і атрымалі лік 98 057.
- Невядомы лік паменшылі на 34 709 і атрымалі лік 128 431.
- Ад ліку 895 044 аднялі невядомы лік і атрымалі лік 32 045.

3. Пабудуй прамавугольны трохвугольнік паводле ўзору.



4. Рашы задачу.

Прайшлі дзве пятых часткі невысакоснага года. Колькі дзён года прайшло?

5. Пабудуй схему. Рашы задачу.

Чарапаха паўзе да морквы са скорасцю 4 м/мін. Адлегласць ад чарапахі да морквы 10 м. Ці паспее яна дапаўзці да морквы за 3 мін?

6. Рашы задачу рознымі спосабамі.

За адзін рэйс машына можа перавезці 120 скрынь з гароднінай. Трэба перавезці 480 скрынь з агуркамі і 360 скрынь з памідорамі. Колькі рэйсаў павінна зрабіць машына?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Урок 39

Ты ўжо ведаеш адзінку часу год. У годзе 365 або 366 сутак. Больш буйная адзінка часу — стагоддзе (або век). 1 стагоддзе роўна 100 гадам.

Запомні!
Стагоддзе — адзінка часу.
1 стагоддзе роўна 100 гадам.
1 ст. = 100 г.

На схеме паказаны 5 стагоддзяў у выглядзе адрэзкаў. Стагоддзі прынята лічыць ад пункта, які называюць так: «пачатак летазлічэння». Гэты пункт на схеме абазначаны лічбай 0. Пункт сіняга колеру на схеме паказвае, калі закончылася 1-е стагоддзе і пачалося 2-е стагоддзе. Пункт чырвонага колеру паказвае, калі закончылася 2-е стагоддзе і пачалося 3-е стагоддзе.



Адкажы на пытанні:

- Колькі гадоў доўжылася першае стагоддзе? Другое стагоддзе? Трэцяе стагоддзе? Першыя тры стагоддзі?
- Канец якога стагоддзя абазначаны на схеме пунктам зялёнага колеру?
- Пачатак якога стагоддзя абазначаны пунктам зялёнага колеру?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Паміж якімі пунктамі на схеме размешчаны пункт, які абазначае 150-ы год? 347-ы год? Якое гэта стагоддзе?



Першае стагоддзе доўжылася 100 гадоў і закончылася сотым годам (пункт сіняга колеру на схеме). Другое стагоддзе доўжылася яшчэ 100 гадоў і закончылася двухсотым годам (пункт чырвонага колеру на схеме). 150-ы год размешчаны паміж 100-м годам і 200-м годам. Значыць, на схеме пункт, які абазначае 150-ы год, будзе знаходзіцца паміж пунктамі сіняга і чырвонага колераў. На схеме бачна, што 150-ы год — гэта другое стагоддзе.

2. Вылічы.

300 – 252 : 3 822 : (52 : 26) 92 · 3 + 92 · 5

3. Вылічы.

305 567 + 1407 + 45 907 12 890 + 104 010 + 4009
40 904 + 600 106 + 905 96 032 + 645 296 + 267

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Выберы схему. Рашы задачу.

Турысты спачатку ішлі 3 г са скорасцю 5 км/г, потым зрабілі прывал. Пасля прывалу яны былі ў дарозе 2 г і ішлі са скорасцю 6 км/г. Якую адлегласць прайшлі турысты за ўвесь час?



5. Рашы задачу.

Трыццаць літраў яблычнага соку разлілі ў трохлітровыя слоікі. Колькі літраў соку можна разліць у такую ж колькасць двухлітровых слоікаў?

6. Пабудуй прамавугольны трохвугольнік з даўжынямі старон, указанымі на малюнку.



7. Выкажы здагадку, якой можа быць даўжыня твайго алоўка ў міліметрах. Правер сваю здагадку з дапамогай лінейкі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Успомні!

У лікавых выразах без дужак,
якія ўтрымліваюць толькі складанне і адніманне
або толькі множанне і дзяленне,
дзеянні выконваюць па парадку злева направа.

1 2 3 4
300 – 60 + 10 – 200 + 2 = 52
1 2 3 4
450 · 2 : 3 · 4 : 6 = 200

1. Укажы парадак дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

4000 – 345 + 2308
65 402 + 2394 – 12 900
12 + 203 + 98 304 – 36 000

70 · 3 : 21
200 · 3 : 200
540 : 30 : 9 · 5

Успомні!

У лікавых выразах без дужак, якія
ўтрымліваюць усе чатыры дзеянні, спачатку
выконваюць па парадку (злева направа)
множанне або дзяленне, а потым па парадку (злева
направа) складанне або адніманне.

3 1 4 2
300 – 60 · 2 – 200 : 2 = 80

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Укажы парадак дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

12 600 + 45 689 – 560 : 70
700 + 40 000 : 5 – 20 · 3
6385 – 42 · 8
40 000 – 47 · 7
56 · 4 + 88 · 6
72 · 9 – 34 · 5

3. Складзі і рашы ўраўненні.

- Ад ліку 56 409 аднялі невядомы лік і атрымалі лік 12 003.
- Да ліку 478 дадалі невядомы лік і атрымалі 6209.

4. Рашы задачу.

Якой была адлегласць паміж прыстанямі, калі палову гэтай адлегласці катар прайшоў за 2 г са скорасцю 25 км/г?

5. Рашы задачу з дапамогай схемы.

Першае згадванне пра Мінск у летапісе было ў 1067 годзе. У якім стагоддзі Мінск быў упершыню згаданы ў летапісе?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Прайшло 1000 гадоў ад пачатку летазлічэння. Значыць, закончылася 10-е стагоддзе. Наступнае стагоддзе — 11-е. Значыць, 1067-ы год — гэта 11-е стагоддзе.

6. Выберы схему. Рашы задачу.

У стопку кніг паклалі яшчэ 10 кніг. Пасля гэтага ў ёй стала ў тры разы больш кніг, чым было. Колькі кніг было ў стопцы спачатку?



7. Параўнай.

4056 г ☐ 40 кг 56 г
1570 г ☐ 15 кг 70 г
55 000 г ☐ 5 кг 500 г
7 кг 8 г ☐ 708 г
8 кг 200 г ☐ 8200 г
4010 г ☐ 4 кг 10 г

8. Знайдзі плошчу квадрата, даўжыня стараны якога роўна 8 дм.

9. Праілюструй задачу і рашы яе.

Маса 3 кубкаў і 1 збана роўна масе 10 шклянак. Збан ураўнаважвае 2 шклянкі і 1 кубак. Колькі шклянак ураўнаважаць збан?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Успомні!

У лікавых выразах з дужкамі дзеянні ў дужках выконваюць першымі.

2 1

600 : (30 – 27) = 200

1. Укажы парадак дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

96 : (12 · 8)
(600 – 360) : 3
300 · 7 – (234 + 1300)
140 · 5 – (1000 – 896)
80 · (427 – 422) : 200
29 · 2 · 5 + (345 + 123)

Запомні!

У лікавых выразах, якія ўтрымліваюць некалькі пар дужак, спачатку па парадку (злева направа) знаходзяць значэнні выразаў у дужках, а затым у тым жа парадку выконваюць астатнія дзеянні.

1 3 2 4

(600 + 200) : (30 – 26) + 200 = 400

2. Укажы парадак дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

(200 + 160) : 3 + (120 + 360) : 4
6090 – (24 153 – 21 849) + (53 – 39)
(902 281 – 12 649) – (76 032 + 12 649) · 1

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Рашы задачу.

Таварны цягнік быў у дарозе 2 г і праехаў 160 км. Пасажырскі цягнік за той жа час праехаў 200 км. Скорасць якога цягніка большая? На колькі кіламетраў у гадзіну большая?

4. Рашы задачу.

За 2 дні зубр з'ядае каля цэнтнера зялёнай масы. Колькі кілаграмаў зялёнай масы з'ядае статак з 5 зуброў за 8 дзён?

5. На дыяграме паказана працягласць жыцця ў стагоддзях розных дрэў, якія растуць у Беларусі. Запішы назвы парод дрэў у парадку павелічэння працягласці іх жыцця.



6. Вылічы.

740 кг – 315 кг
120 т – 92 т
270 км – 137 км
260 мм – 128 мм
840 м – 804 м
630 ц – 119 ц

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Начарці акружнасць з радыусам 5 см. Пабудуй адрэзак *AB*, які перасякае акружнасць. Пабудуй адрэзак *OL* унутры акружнасці. Пабудуй адрэзак *KN* па-за акружнасцю.

Урок 42

1. Укажы парадак дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

(450 · 2 – 100) : 8 (607 – 307) : (400 – 100)
9 · (85 · 3 – 45) 60 805 – (845 – 785) · 1

2. Рашы ўраўненні.

x – 5046 = 240 555 300 000 – y = 333

3. Выберы адпаведныя значэнні выразаў.

465 + 809	1274, 1774, 1104
980 + 317	1317, 1203, 1297
1017 + 493	1510, 1410, 1640

4. Рашы задачу.

Скорасць слабага ветру 4 м/с, што ў 8 разоў менш, чым скорасць ураганнага ветру. На колькі метраў у секунду скорасць ураганнага ветру большая, чым скорасць слабага ветру?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Рашы задачу.

Маса слана роўна масе 9 жырафаў. Маса жырафа 4 ц. Ежа, якую чалавек з'ядае на працягу жыцця, роўна па масе прыкладна 4 сланам. Колькі кілаграмаў ежы ў сярэднім з'ядае чалавек за сваё жыццё?

6. Растлумач, што абазначаюць выразы.

Віця ішоў 8 мін са скорасцю a м/мін. Потым ён павялічыў скорасць на 10 м/мін і ішоў яшчэ 5 мін.

$a \cdot 8$ $\quad$ $a + 10$ $\quad$ $(a + 10) \cdot 5$

7. Пабудуй схему. Рашы задачу.

Першы беларускі касманаўт Пётр Клімук паляцеў у космас у 1973 годзе. У якім стагоддзі Пётр Клімук паляцеў у космас?

8. Начарці акружнасці з радыусамі 3 см і 15 мм паводле ўзору. Чым падобныя і чым адрозніваюцца малюнкі?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

9. Стужку якой даўжыні трэба ўзяць, каб перавязаць падарунак?



Урок 43

1. Рашы ўраўненні.

x – 23 005 = 15 345 156 603 – y = 23

2. Вылічы.

61 077 – (4819 + 2326) 6300 : 7 · 5 – 3200

58 567 – (15 – 7) · (43 – 3) 200 · 8 – 600 · 0

3. Назаві прамавугольныя, востравугольныя і тупавугольныя трохвугольнікі. Выпішы назвы ўсіх адрэзкаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Рашы задачу.

Веласіпедыст некалькі гадзін ехаў са скорасцю 12 км/г, а астатнюю дарогу ён адолеў за 4 г са скорасцю 15 км/г. Уся дарога склала 96 км. Колькі часу веласіпедыст ехаў першую частку дарогі?

5. Рашы задачу.

Шнур даўжынёй 90 см разрэзалі на дзве часткі так, што адна частка аказалася даўжэйшай за другую на 20 см. Знайдзі даўжыню кожнай часткі.

6. Рашы задачу.

У кнізе 75 старонак. У першы дзень Таня прачытала $\frac{2}{5}$ часткі кнігі, а ў другі дзень — 11 старонак. Колькі старонак засталося прачытаць Тані?

7. Рашы задачу.

Назаві свой год нараджэння. Якое гэта стагоддзе? Назаві гады нараджэння сваіх бацькоў. Якое гэта стагоддзе?

8. Параўнай.

8 ц 50 кг ☐ 820 кг 4 т 6 ц ☐ 46 ц

3 т 6 ц 40 кг ☐ 36 040 кг 3 ц 5 кг ☐ 440 кг

9. У цесляра 24 кг цвікоў і рычажныя шалі без гір. Як адмераць 9 кг цвікоў?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Урок 44

1. Рашы задачу.

Цягнік прайшоў 480 км за 6 г. Якую адлегласць цягнік пройдзе за 8 г, рухаючыся з той жа скорасцю?

Скорасць, км/г	Час, г	Адлегласць, км
аднолькавая	6	480
	8	?



2. Рашы задачу.

За 5 с Косця прабег 60 м. Колькі метраў ён прабяжыць за 7 с, калі яго скорасць не зменіцца?

3. Рашы задачу.

У каробцы 48 пакецікаў з чаем. Ці хопіць сям'і гэтага чаю на тыдзень, калі кожны дзень сям'я выкарыстоўвае $\frac{2}{8}$ часткі гэтых пакецікаў?

4. Начарці прамавугольнік, плошча якога роўна 20 см^2. Знайдзі яго перыметр.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Складзі выразы і знайдзі іх значэнні.

- У суме першае складаемае — рознасць лікаў 60 і 50, а другое складаемае — здабытак гэтых лікаў.
- У суме першае складаемае — дзель лікаў 480 і 60, а другое складаемае — рознасць гэтых лікаў.
- У суме першае складаемае — лік 10 000, а другое складаемае — здабытак лікаў 0 і 45.

6. Параўнай, не вылічваючы.

20 567 – 345 · 3 ☐ 20 657 – 345 · 3
360 · 6 + 450 · 6 ☐ (360 + 450) · 6
2375 + 600 : 4 ☐ 600 : 4 + 20 375

7. Вылічы.

1367 + 2725 + 5414
4520 + 12 689 + 2149
34 200 + 12 467 + 73 218
186 401 + 5700 + 2354

8. Вылічы.

8 м + 60 см + 3 см
5 дм + 7 м – 20 см
12 м + 36 см + 10 мм
15 см + 3 мм – 12 см
43 дм + 125 м + 8 см
16 мм + 14 мм + 1 дм

9. Мама выходзіла з дому праз 1 г 20 мін пасля выхаду Марыны. У Марыны ў 15 г 40 мін пачынаецца рэпетыцыя ў школе. Каб дайсці да школы, Марыне трэба 20 мін. Марына ніколі не спазняецца. У колькі гадзін мама выйшла з дому?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Вылічы паводле ўзору.

12 км 285 м + 13 км 57 м = 25 км 342 м
12 км 285 м = 12 285 м
13 км 57 м = 13 057 м

$$\begin{array}{r} 12\,285 \\ +\ \underline{13\,057} \\ 25\,342 \end{array}$$

25 342 м = 25 км 342 м

23 км 450 м + 45 км 200 м
176 км 203 м – 34 км 40 м
890 км 456 м – 48 км 398 м

2. Вылічы паводле ўзору.

$$\begin{array}{r} 12\text{ дм }\ 65\text{ см} \\ +\ \underline{13\text{ дм }\ 17\text{ см}} \\ 25\text{ дм }\ 82\text{ см} \end{array}$$

46 дм 36 см + 17 дм 45 см
89 дм 26 см – 34 дм 19 см
124 дм 6 см + 49 дм 40 см

3. Рашы задачу.

Лыжнік праехаў спачатку 12 км 240 м, а потым яшчэ 23 км 760 м за 3 г. За які час ён праедзе 48 км, рухаючыся з той жа скорасцю?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Саша на дыяграме паказаў, колькі грыбоў кожнага віду ён знайшоў. Яго сястра Света знайшла ў 2 разы менш грыбоў кожнага віду. Пабудуй у сшытку дыяграму, на якой будзе паказана, колькі грыбоў кожнага віду знайшла Света.



5. Складзі розныя задачы, выкарыстоўваючы даныя з табліцы. Рашы адну задачу.

	Каўбаса	Сасіскі	Сыр	Цукеркі
Купілі	300 г	500 г	400 г	1 кг
З'ела кацяня	50 г	?	10 г	0 г
З'ела шчаня	100 г	180 г	?	50 г
З'еў Пеця	150 г	200 г	100 г	?
Засталося	?	120 г	90 г	100 г

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Вылічы.

256 000 + 346 000 507 000 + 45 000
907 340 – 234 784 98 000 + 560 000
354 123 + 123 354 409 465 – 98 230

7. Рашы задачу.

Прывезлі 8 скрынь вінаграду, па 5 кг у кожнай скрыні. Увесь вінаград перасыпалі ў пакеты, па 2 кг у кожны. Колькі пакетаў атрымалася?

8. Рашы ўраўненні.

$x - 350 = 650$ $y + 240 = 420$ $355 : z = 5$

9. Складзі і рашы ўраўненні.

Складаемае	*a*	4354	54 800	*a*
Складаемае	45 000	*a*	*a*	49 872
Сума	345 120	8675	59 783	89 471

10. Начарці 4 прамяні з пачаткам у адным пункце *O*. Пабудуй ад пункта *O* на кожным прамені адрэзкі *OB*, *OC*, *OK*, *OM* даўжынёй па 2 см.

Выкажы здагадку, ці можна правесці акружнасць з цэнтрам у пункце *O* так, каб пункты *B*, *C*, *K* і *M* аказаліся на гэтай акружнасці? Унутры гэтай акружнасці? Па-за гэтай акружнасцю? Правер сваю здагадку з дапамогай цыркуля.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Урок 46

1. Вылічы паводле ўзору.

204 кг 347 г + 28 кг 45 г = 232 кг 392 г
204 кг 347 г = 204 347 г
28 кг 45 г = 28 045 г

$$\begin{array}{r} 204\ 347 \\ +\ \underline{28\ 045} \\ 232\ 392 \end{array}$$

232 392 г = 232 кг 392 г

509 кг 299 г + 129 кг 78 г
342 т 867 кг + 378 т 109 кг
769 кг 456 г – 278 кг 328 г
409 т 768 кг – 230 т 128 кг

2. Вылічы паводле ўзору.

$$\begin{array}{r} 13\ \text{ц}\ 28\ \text{кг} \\ +\ \underline{29\ \text{ц}\ 57\ \text{кг}} \\ 42\ \text{ц}\ 85\ \text{кг} \end{array}$$

17 ц 23 кг + 12 ц 45 кг
56 т 3 ц + 33 т 2 ц
68 ц 34 кг – 26 ц 19 кг
95 т 35 кг – 68 т 29 кг

3. Вылічы.

23 599 – 19 506
197 345 + 298 593
67 209 + 13 256
45 030 + 27 899
49 700 – 12 346
798 409 – 321 480

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Рашы задачу.

Машына везла цэглу. Маса машыны з грузам 5 т 8 ц 70 кг. Маса гэтай машыны пасля разгрузкі 3 т 170 кг. Якой была маса грузу?

5. Рашы задачу рознымі спосабамі.

Цягнік ішоў са скорасцю 70 км/г. Да першага прыпынку ён быў у дарозе 2 г, а ад першага прыпынку да другога — 4 г. Якую адлегласць прайшоў цягнік за ўвесь гэты час?

6. Складзі і рашы задачу.

Літраў у адным вядры	Колькасць вёдзер	Літраў ва ўсіх вёдрах
аднолькава	3	24
	9	?

У колькі разоў больш вёдзер?
У колькі разоў больш літраў?

7. Выразі ў меншых адзінках вымярэння.

8 км	3 дм 2 см	4 дм 56 см
8 т 5 ц	9 ц 78 кг	5 т 14 ц

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

8. Якія даныя з табліцы можна паказаць на дыяграме? Пабудуй дыяграму.

Горад	Герб	Узрост (у стагоддзях)
Брэст		9
Віцебск		10
Гомель		8
Гродна		8
Мінск		9
Магілёў		7

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Вылічы паводле ўзору.

25 дм^2 13 см^2 + 66 дм^2 52 см^2 = 91 дм^2 65 см^2
25 дм^2 13 см^2 = 2513 см^2
66 дм^2 52 см^2 = 6652 см^2

$$\begin{array}{r} 2513 \\ +\ \underline{6652} \\ 9165 \end{array}$$

9165 см^2 = 91 дм^2 65 см^2

37 дм^2 14 см^2 + 42 дм^2 51 см^2
87 дм^2 54 см^2 – 46 дм^2 23 см^2
17 дм^2 42 см^2 + 36 дм^2 33 см^2
98 дм^2 13 см^2 – 59 дм^2 12 см^2

2. Вылічы паводле ўзору.

24 дм^2 18 см^2 + 25 дм^2 71 см^2
69 дм^2 87 см^2 – 37 дм^2 33 см^2
46 дм^2 63 см^2 + 25 дм^2 13 см^2
73 дм^2 48 см^2 – 65 дм^2 39 см^2

$$\begin{array}{r} 35\ \text{дм}^2\ 28\ \text{см}^2 \\ +\ \underline{23\ \text{дм}^2\ 51\ \text{см}^2} \\ 58\ \text{дм}^2\ 79\ \text{см}^2 \end{array}$$

3. Вылічы.

32 · 9 : 4 + 23 508
78 : 26 · 144 – 200
540 : 6 + 155 : 5
720 : 9 + 234 679 – 123

3600 : 600 · 12
4800 : 8 · 9
5000 · 3 : 5000
15 000 · 0 · 12

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Складзі і рашы задачу.

	Скорасць, см/мін	Час, мін	Адлегласць, см
Смоўж	4	аднолькавы	20
Жук	120		?

5. Вызнач па праграме тэлеперадач, колькі часу доўжылася кожная перадача.

Час	Назва перадачы
8.00	Навіны
8.15	Пад купалам цырка
8.45	Музычная шкатулка
9.00	Мультфільмы
9.30	Гісторыя Беларусі. 8 клас
9.55	Прагноз надвор'я

6. Рашы задачу.

Даша і Маша спаборнічалі ў бегу на 30 м. Маша прабегла дыстанцыю за 4 с, а Даша за 6 с. Чыя скорасць большая? Растлумач з дапамогай схемы, не вылічваючы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Рашы задачу.

Хлопчык прачытаў дзве пятых часткі кнігі. Колькі старонак засталося прачытаць хлопчыку, калі ў кнізе 60 старонак?

Урок 48

1. Вылічы.

436 км 132 м + 559 км 86 м
75 см 25 мм + 16 см 34 мм
782 т 162 кг – 564 т 29 кг

240 дм^2 : 6
4800 ц : 300
5100 л · 2

2. Вылічы.

1700 · 3
9600 : 6
8400 : 42
8400 : 400

123 · 3 – 178 + 476 345 – 49 345
234 067 + (462 : 2 – 150) – 2489
636 : 3 · 2 + 25 412 + 8456
(20 665 + 4 · 5) + (969 : 3 + 2129)

3. Рашы задачу.

Веласіпедыст праехаў 40 км ад вёскі Баяры да вёскі Коласава са скорасцю 20 км/г. Потым ён адпачываў 3 г. Колькі гадзін спатрэбілася веласіпедысту на дарогу і адпачынак?

4. Рашы задачу.

У некалькі школьных буфетаў усяго прывезлі 7500 пакетаў кефіру і малака. Кожная школа атрымала па 25 пакетаў кефіру, а малака — у 3 разы больш, чым кефіру. Колькі школ атрымалі малако і кефір?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Рашы задачу.

Цягнік выйшаў з Гомеля ў 17 г 15 мін і прыбыў у Мінск у 22 г 15 мін. Ад Гомеля да Мінска каля 320 км. Знайдзі скорасць руху цягніка.

Здагадайся, на якіх гадзінніках паказаны час адпраўлення цягніка з Гомеля і час прыбыцця цягніка ў Мінск. Прачытай паказанні гадзіннікаў з дапамогай слоў «палова», «чвэрць».



6. Рашы задачу. Выберы малюнак, які адпавядае задачы.

Даўжыня аднаго звяна ломанай 20 см. Гэта $\frac{1}{3}$ частка даўжыні ўсёй ломанай. Знайдзі даўжыню ломанай.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Урок 49

1. Прадстаў лікі ў выглядзе сумы разрадных складаемых.

345 802 740 900 62 345

2. Вылічы.

47 дм^2 24 см^2 + 45 дм^2 29 см^2
58 т 12 ц + 12 т 9 ц
74 дм 20 см + 15 дм 95 см

47 000 м^2 · 2
69 000 ц : 3
81 000 дм : 9

3. Параўнай.

3 км 23 м ☐ 303 230 м
45 ц 9 кг ☐ 4 т 290 кг
12 сут. ☐ 24 г

45 м 123 мм ☐ 5 дм
143 т 9 ц ☐ 1430 кг
360 мін ☐ 6 г

4. Рашы задачу.

Леў можа бегчы 400 м са скорасцю 20 м/с. За які час леў прабяжыць гэту адлегласць? За які час прабяжыць гэту адлегласць Міця, калі будзе бегчы са скорасцю 8 м/с?

5. Начарці прамавугольны трохвугольнік. Правядзі адрэзак так, каб падзяліць яго на трохвугольнік і чатырохвугольнік.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Рашы задачу.

Дзве машыны адначасова выехалі з запраўкі ў процілеглых напрамках. Скорасць першай машыны 40 км/г, а скорасць другой — 60 км/г. Якая адлегласць будзе паміж машынамі праз 1 г?

7. Рашы задачу рознымі спосабамі.

Каб пафарбаваць грузавы аўтамабіль, патрабуецца 750 г фарбы, а каб пафарбаваць прычэп — 375 г фарбы. Колькі грамаў фарбы трэба для таго, каб пафарбаваць 5 аўтамабіляў з прычэпамі?

8. Для запісу значэння здабытку $1 \cdot 2 \cdot 3 \cdot 4 \cdot \ldots \cdot 48 \cdot 49 \cdot 50$ патрабуецца 65 лічбаў. Колькі радкоў сшытка зойме запіс гэтага ліку, калі пад кожную лічбу адводзіць адну клетку? На колькі больш лічбаў у запісе гэтага ліку, чым у запісе ліку мільён?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Рашы задачу.

Два пешаходы адначасова выйшлі з вёскі ў процілеглых напрамках. Скорасць першага пешахода 4 км/г, а скорасць другога — 6 км/г. На якой адлегласці адзін ад аднаго яны апынуцца праз 2 г?



Спосаб 1

Спачатку даведаюся, колькі кіламетраў пройдзе першы пешаход за 2 гадзіны.

Потым даведаюся, колькі кіламетраў пройдзе другі пешаход за 2 гадзіны.

Цяпер можна даведацца, на якой адлегласці адзін ад аднаго апынуцца пешаходы праз 2 гадзіны.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Спосаб 2

Спачатку даведаюся, на колькі кіламетраў пешаходы аддаляцца адзін ад аднаго за 1 гадзіну (скорасць аддалення).

Потым даведаюся, якая адлегласць будзе паміж імі праз 2 гадзіны.

2. Рашы задачу.

Два веласіпедысты адначасова выехалі з пасёлка ў процілеглых напрамках. Іх скорасці 18 км/г і 15 км/г. Якая адлегласць будзе паміж імі праз 3 г?



3. Рашы задачу.

У доме 150 двухпакаёвых кватэр і 125 трохпакаёвых. Колькі кватэр у трох такіх дамах?

4. Вылічы.

459 – (867 – 848) · 3 + 34 209 24 000 · 3

243 089 – 13 476 + 76 : 19 + 15 240 000 · 3

5. Рашы ўраўненні.

x – 456 309 = 78 398 984 230 – y = 286 306

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Запішы лікі ў парадку памяншэння.

- Шэсцьдзясят тысяч пяцьсот.
- Чатырыста сорак тысяч дзвесце.
- Трыццаць сем тысяч пяць.
- Шэсцьдзясят тысяч пяцьдзясят.
- Восем тысяч чатырыста.

7. Начарці квадрат, перыметр якога 24 см. Вылічы яго плошчу.

Урок 51

Для вымярэння вялікіх плошчаў выкарыстоўваюць адзінку плошчы квадратны метр.

Запомні!

Плошча квадрата са стараной 1 м роўна аднаму квадратнаму метру (1 м^2).
Квадратны метр — гэта адзінка плошчы.

1. Колькі квадратных дэцыметраў размяшчаецца ў адным радзе ўздоўж стараны квадрата плошчай 1 м^2? Колькі такіх радоў?

Колькі ўсяго квадратных дэцыметраў размяшчаецца на паверхні квадрата плошчай 1 м^2?

У адным квадратным метры
100 квадратных дэцыметраў.
1 м^2 = 100 дм^2

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Колькі квадратных сантыметраў размяшчаецца ў адным радзе ўздоўж стараны квадрата плошчай 1 м^2? Колькі такіх радоў?

Колькі ўсяго квадратных сантыметраў размяшчаецца на паверхні квадрата плошчай 1 м^2?

У адным квадратным метры 10 000 см^2.

1 м^2 = 10 000 см^2

3. Вылічы.

5 м^2 + 500 м^2

17 м^2 + 24 дм^2

28 м^2 + 513 см^2

65 м^2 23 дм^2 + 25 м^2 54 дм^2

37 м^2 57 дм^2 – 24 м^2 49 дм^2

47 дм^2 17 см^2 + 36 дм^2 54 см^2

4. Рашы задачу.

Адзін участак зямлі мае плошчу 150 м^2. Яго плошча роўна палове плошчы другога ўчастка. Знайдзі плошчу двух зямельных участкаў.

5. Складзі выраз, які з'яўляецца рашэннем задачы.

У тваім класе a дзяўчынак і b хлопчыкаў. У кожнага з вас па 5 падручнікаў. Колькі ўсяго падручнікаў у вучняў твайго класа?

Падстаў замест літар a і b неабходныя лікі і рашы задачу.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Рашы задачу.

Два смаўжы адначасова папаўзлі ад адной кветкі ў процілеглых напрамках. Іх скорасці 4 см/мін і 5 см/мін. На якой адлегласці адзін ад аднаго яны будуць праз 2 мін?

7. Складзі выразы. Знайдзі іх значэнні.

Складаемае	25 247	320 · 3	14 789	25 + 25 194
Складаемае	18 449	960 : 16	5200 · 2	1000 · 8

8. Рашы задачу.

Вядомы мараплавец Хрыстафор Калумб упершыню прыплыў у Амерыку ў 1492 годзе. У якім стагоддзі гэта адбылося? Колькі стагоддзяў прайшло пасля гэтай падзеі?

Урок 52

Для вымярэння вялікіх плошчаў выкарыстоўваюць адзінку плошчы гектар.

Запомні!
Плошча квадрата са стараной 100 м роўна аднаму гектару (1 га).
Гектар — гэта адзінка плошчы.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Вылічы, колькі квадратных метраў у адным гектары. Колькі квадратных метраў у двух гектарах?

2. Вылічы.

123 409 + 234 176 – 47 200	240 000 · 3
298 567 – (178 309 – 56 300)	900 000 : 3
354 729 + 123 908 – 987	12 000 : 3000
123 498 · 1 + 345 107 – 356	72 000 : 24
(234 + 985) + (2100 – 1763)	1800 · 4

3. Параўнай.

400 кг ☐ 2 ц	700 кг ☐ 1 т	400 кг + 600 кг ☐ 1 т
100 кг ☐ 4 ц	70 кг ☐ 1 ц	1 т – 850 кг ☐ 1 ц

4. Рашы ўраўненні.

$452\,904 - y = 28\,456$ $\qquad$ $123\,907 + z = 573\,000$

5. Рашы задачу.

Трактарысту трэба ўзараць 12 га зямлі. Ён ужо ўзараў $\frac{2}{6}$ часткі гэтай зямлі. Колькі гектараў зямлі ўзараў трактарыст? Колькі квадратных метраў зямлі ўзараў трактарыст?

6. Рашы задачу.

У сталовай за тыдзень зрасходавалі 28 кг смятаны, пароўну ў кожны дзень. На колькі дзён хопіць 136 кг смятаны, калі яе штодзённы расход не зменіцца?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Рашы задачу.

Два пешаходы адначасова выйшлі з двух пасёлкаў насустрач адзін аднаму. Скорасць першага пешахода 4 км/г, скорасць другога — 6 км/г. На колькі кіламетраў зменшыцца адлегласць паміж імі праз 1 г?

8. Колькі трохзначных лікаў можна саставіць з лічбаў 4 і 5, калі лічбы ў ліках могуць паўтарацца?

Урок 53

1. Рашы задачу.

Два цягнікі адначасова выйшлі насустрач адзін аднаму з двух гарадоў і праз 2 г сустрэліся. Скорасць першага цягніка — 80 км/г, скорасць другога — 70 км/г. Вызнач адлегласць паміж гарадамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Спосаб 1

Спачатку даведаюся, колькі кіламетраў прайшоў першы цягнік за 2 гадзіны.

Потым даведаюся, колькі кіламетраў прайшоў другі цягнік за 2 гадзіны.

Цяпер можна даведацца, на якой адлегласці адзін ад аднаго цягнікі былі 2 гадзіны назад, г. зн. высветліць адлегласць паміж гарадамі.



Спосаб 2

Спачатку даведаюся, на колькі кіламетраў збліжаліся цягнікі за 1 гадзіну (скорасць збліжэння).

Потым даведаюся, на якой адлегласці адзін ад аднаго цягнікі былі 2 гадзіны назад, г. зн. высветлю адлегласць паміж гарадамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Рашы задачу.

Два жукі адначасова папаўзлі насустрач адзін аднаму. Іх скорасці 2 см/с і 3 см/с. На колькі сантыметраў скароціцца адлегласць паміж імі праз 4 с?

3. Рашы задачу.

Два абутковых майстры адрамантавалі абутку пароўну. Адзін з іх працаваў 4 дні і штодня рамантаваў па 12 пар абутку. Другі працаваў 6 дзён. Колькі пар абутку ў дзень ён рамантаваў?

4. Рашы задачу.

Плошча першага ўчастка 27 га. Гэта ў 3 разы менш за плошчу другога ўчастка. Знайдзі палову плошчы гэтых двух участкаў.

5. Вылічы.

9475 + 34 200 – 4520	17 000 · 4
30 715 + 806 491 + 6456	1700 · 4
12 689 – 2403 + 57 000	170 000 · 4
8409 + 73 218 – 2149	170 · 4

6. Складзі ўраўненні і рашы іх.

- Невядомы лік падзялілі на 8 і атрымалі 124.
- Да 476 109 дадалі невядомы лік і атрымалі 900 000.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Выразі ў кіламетрах і метрах.

7234 м 5347 м 967 456 м 345 209 м

8. Начарці квадрат *MNOP*, даўжыня стараны якога 3 см. Начарці яго дыяганалі. Параўнай даўжыні дыяганалей з дапамогай цыркуля. Знайдзі на чарцяжы прамавугольныя трохвугольнікі.

Урок 54

1. Рашы задачу.

Голуб і верабей паляцелі са сваіх гнёздаў насустрач адзін аднаму і праз 2 г сустрэліся. Скорасць голуба 80 км/г, а скорасць вераб'я ў 2 разы меншая. Знайдзі адлегласць паміж гнёздамі голуба і вераб'я.



2. Растлумач з дапамогай схемы, што абазначаюць выразы.

$90 \cdot 3$ $70 \cdot 3$ $90 + 70$ $(90 + 70) \cdot 3$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Складзі пытанне. Рашы задачу.

На пчальніку сабралі 1 т 500 кг мёду. Трэць гэтага мёду прадалі на рынку, 84 кг пакінулі для падкормкі пчол зімой, а астатні мёд здалі ў магазін.

4. Параўнай, не вылічваючы.

80 600 + 4890 ☐ 80 060 + 4090
75 050 – 5 ☐ 75 000 – 5
601 680 – 91 000 ☐ 601 680 – 90 010
390 000 : 3 ☐ 30 090 : 3

5. Вылічы.

600 070 – 60	3400 · 2	18 000 : 4
81 000 : 9	27 000 · 3	600 000 : 3
200 000 · 4	640 000 : 8	12 000 : 4000

6. Запішы лікі і размясці іх у парадку памяншэння.

- Восемдзесят дзве тысячы чатырыста пяць.
- Трынаццаць тысяч сто.
- Сорак тысяч сорак.
- Пяць тысяч дзевяноста.
- Дзвесце дваццаць.
- Дзвесце дзве тысячы пяцьдзясят тры.
- Семсот дзевяноста тысяч восемсот дзевяноста.
- Пяцьсот тысяч пяць.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Запоўні табліцу.

Памяншаемае	698	36 405		1 000 000
Аднімаемае			28 700	
Рознасць	179	7480	34 567	379 586

8. Плошчы якіх фігур можна параўнаць, падлічваючы клеткі? Чаму? Параўнай плошчы фігур.



Урок 55

1. Вылічы.

8472 + (132 · 5 + 132 · 4)
(1000 – 408 : 6) + 265 305
140 376 – (25 560 – 34 · 4)
23 456 + 455 : 5 · 1 – 8304

3200 : 8
3200 : 800
240 000 : 6
240 000 : 60 000

2. Рашы ўраўненні.

x + 25 398 = 60 386
384 – k = 111
a + 4298 = 600 000

3 · c = 7200
y : 4 = 12 000
k · 41 236 = 0

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

3. Вылічы.

342 км 465 м + 464 км 200 м
476 т 3 ц – 34 т 1 ц
856 км 900 м – 143 км 398 м
604 т 8 ц – 156 т

4. Рашы задачу.

Два веласіпедысты выехалі адначасова з двух пасёлкаў насустрач адзін аднаму і сустрэліся праз 3 г. Скорасць першага веласіпедыста 16 км/г, скорасць другога — 14 км/г. Знайдзі адлегласць паміж пасёлкамі.

5. Рашы задачу.

Скорасць аднаго пешахода 4000 м/г, скорасць другога — 6 км/г. За які час кожны пешаход зможа прайсці 12 км?

6. Складзі выраз да задачы. Складзі другую задачу па гэтым выразе.

Прывезлі 1500 кг бульбы, а цыбулі — у a разоў менш. Колькі кілаграмаў бульбы і цыбулі прывезлі?

7. Пабудуй квадрат, перыметр якога 16 см. Вылічы яго плошчу. Начарці дыяганалі квадрата. Вылічы плошчы трохвугольнікаў, якія атрымаліся.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

МНОЖАННЕ І ДЗЯЛЕННЕ МНАГАЗНАЧНЫХ ЛІКАЎ

Урок 56

$4 \cdot 3 = 3 \cdot 4$

Успомні **перамяшчальную** ўласцівасць множання:
ад перастаноўкі множнікаў
здабытак не мяняецца.
$a \cdot b = b \cdot a$

1. Параўнай.

$34 \cdot 3 \square 3 \cdot 34$ $\quad$ $453 + 345 \square 354 + 453$

$45 \cdot 2 \square 2 \cdot 45$ $\quad$ $5200 + 200 \square 200 + 5200$

Успомні!
Калі ў здабытку адзін з множнікаў
роўны нулю, то значэнне здабытку роўна нулю.
$0 \cdot a = 0$
$a \cdot 0 = 0$

2. Вылічы.

$0 \cdot 123$ $\quad$ $234\,500 - 198 \cdot 0$ $\quad$ $256 - 234 \cdot 0$

$567 \cdot 0$ $\quad$ $0 \cdot 3456 + 190$ $\quad$ $27 \cdot 0 + 0 \cdot 154$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Успомні!

Калі ў здабытку адзін з множнікаў — лік 1, то значэнне здабытку роўна другому множніку.

$1 \cdot a = a$

$a \cdot 1 = a$

3. Вылічы.

$1 \cdot 67\,487$	$845\,254 - 123\,400 \cdot 1$
$13\,298 + 24\,534 \cdot 1$	$89\,506 \cdot 1$
$1 \cdot 398\,300 - 84\,506$	$1 \cdot 45\,365 + 999$

4. Рашы задачу.

На нарыхтоўцы лесу за адзін дзень спілавалі 1200 сосен і ў 3 разы менш бяроз. Колькі ўсяго дрэў спілавалі?

5. Рашы задачу.

У 15 г 30 мін з двух гарадоў адначасова выйшлі насустрач адзін аднаму два цягнікі. Цягнікі сустрэліся ў 19 г 30 мін. Скорасць першага цягніка — 90 км/г, а другога — 70 км/г. Вызнач адлегласць паміж гарадамі.

6. Рашы задачу. Які лік ва ўмове лішні?

Перыметр квадрата 32 дм, а даўжыня яго стараны 8 дм. Даўжыню стараны квадрата павялічылі на 4 дм. Знайдзі перыметр квадрата, які атрымаўся.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. Складзі задачы па табліцы. Рашы задачы.

	Расход тканіны на 1 выраб, м	Колькасць вырабаў, шт.	Расход тканіны на ўсе вырабы, м
1	5	2	?
2	5	4	?
3	5	8	?
4	5	16	?

Як змяняецца колькасць вырабаў?
Як змяняецца расход тканіны?

Урок 57

$(3 + 2) \cdot 4 = 3 \cdot 4 + 2 \cdot 4$

Успомні **размеркавальную** ўласцівасць множання: пры памнажэнні сумы на лік можна кожнае складаемае памножыць на гэты лік і атрыманыя вынікі скласці.

$(a + b) \cdot c = a \cdot c + b \cdot c$

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Знайдзі і прачытай правільныя роўнасці. Растлумач.

$(16 + 17) \cdot 5 = 16 \cdot 5 + 17 \cdot 5$
$(123 + 42) \cdot 3 = 123 \cdot 3 + 42 \cdot 2$
$(250 + 130) \cdot 2 = 250 \cdot 2 + 130$
$(28 + 32) \cdot 4 = 28 \cdot 4 + 32 \cdot 4$

2. Рашы ўраўненні.

$a : 1 = 7345$ $b : 1239 = 0$ $c : 5 = 13\ 000$

3. Вылічы.

$432 \cdot 1 + 20\ 456 - 12\ 005$ $9600 : 6$
$150\ 000 - (32\ 406 + 108\ 594)$ $4500 : 500$

4. Рашы задачу двума спосабамі.

На зямельным участку 500 м^2 займаюць дом і ўсе службовыя пабудовы, а 2000 м^2 — сад і агарод. Знайдзі плошчу 5 такіх участкаў.

5. Рашы задачу.

З 13 м тканіны атрымліваюцца 3 сукенкі. Колькі такіх сукенак можна пашыць з 26 м тканіны?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Я не магу даведацца, колькі метраў тканіны ідзе на 1 сукенку, таму што 13 не дзеліцца на 3 без астачы. Але я магу даведацца, у колькі разоў другі кавалак тканіны даўжэйшы за першы.
У гэтулькі ж разоў павінна атрымацца больш сукенак.

6. Рашы задачу.

Паміж дамамі Міці і Пеці 800 м. Хлопчыкі выйшлі насустрач адзін аднаму. Міця прайшоў $\frac{1}{4}$ частку ўсёй адлегласці, а Пеця — 200 м. Якую адлегласць засталося прайсці хлопчыкам?

7. Рашы задачу.

Бульба варыцца $\frac{1}{3}$ частку гадзіны. Потым трэба яшчэ 5 мін, каб зрабіць пюрэ. У 17 г Света пачала варыць бульбу. У колькі гадзін яна зробіць з яе пюрэ?

8. Параўнай, не вылічваючы.

(2 г + 7 г) · 3 ☐ 2 г · 3 + 7 г · 3
(24 см + 12 см) · 2 ☐ 36 см · 2
(4 т + 3 т) · 5 ☐ 400 кг · 5 + 300 кг · 5
4800 : 6 + 2300 ☐ 4800 : 6 + 3200
234 + 567 ☐ 243 + 576
4365 – 3879 ☐ 5364 – 3879

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

9. Пабудуй прамавугольнік і начарці яго дыяганалі, як паказана на малюнку. Правядзі акружнасць з цэнтрам у пункце *O* і радыусам *OB*. Дзе знаходзяцца пункты *A*, *C* і *D*?



Урок 58

Параўнай вылічэнні. Растлумач.

$$\begin{array}{r} \times\ 3224 \\ 2 \\ \hline 6448 \end{array} \qquad \begin{array}{r} \times\ 143\,224 \\ 2 \\ \hline 286\,448 \end{array}$$

Трэба памножыць мнагазначны лік на адназначны. Спачатку памнажаю разрадныя адзінкі першага класа (адзінкі, дзясяткі, сотні) на адназначны лік.
Потым памнажаю разрадныя адзінкі другога класа (адзінкі тысяч, дзясяткі тысяч, сотні тысяч) на адназначны лік.
Чытаю адказ.

1. Вылічы.

2321 · 2 313 223 · 3 43 241 · 2 122 201 · 4

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Вылічы паводле ўзору.

13 т 243 кг · 2 = 26 т 486 кг
13 т 243 кг = 13 243 кг

$$\begin{array}{r} \times\ 13\,243 \\ 2 \\ \hline 26\,486 \end{array}$$

26 486 кг = 26 т 486 кг

44 т 233 кг · 2	12 кг 211 г · 4	132 ц 33 кг · 3
31 т 123 кг · 3	43 кг 234 г · 2	414 ц 13 кг · 2

3. Выразі ў іншых адзінках масы.

6 ц = ☐ кг	1000 кг = ☐ ц	5 т = ☐ ц
50 ц = ☐ кг	10 000 кг = ☐ ц	50 т = ☐ ц

4. Рашы задачу.

За 3 г майстар робіць 40 загатовак. Колькі загатовак ён можа зрабіць за 6 г, калі будзе працаваць гэтак жа?

- У колькі разоў больш часу будзе працаваць майстар?
- У колькі разоў больш загатовак ён зробіць?

5. Рашы задачу.

Ад пасёлка да горада 28 км. Дзве сёмых часткі дарогі праходзяць па лесе, а астатняя частка дарогі — па полі. Колькі кіламетраў дарогі праходзіць па полі?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Разгледзь схему. Растлумач, што абазначаюць выразы.

$10 - 7$ $\quad$ $10 \cdot 4$ $\quad$ $7 \cdot 4$

$(10 + 7) \cdot 4$ $\quad$ $10 \cdot 4 + 7 \cdot 4$ $\quad$ $10 \cdot 4 - 7 \cdot 4$

7. Рашы задачу.

Мяркуюць, што вялікі беларускі вучоны Францыск Скарына нарадзіўся каля 1490 года. Першую друкаваную кнігу ён выдаў у 1517 годзе. У якім стагоддзі нарадзіўся Францыск Скарына? У якім стагоддзі ён выдаў першую друкаваную кнігу?

8. Пабудуй схему. Рашы задачу.

Прайшло $\frac{3}{4}$ сутак. Колькі цяпер часу?

9. Начарці тупы вугал *AOB*. Правядзі прамень з пачаткам у пункце *O* так, каб атрымаліся два вострых вуглы. Ці можна правесці прамень так, каб атрымаліся прамы і востры вуглы?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Параўнай вылічэнні. Растлумач.

$$\times\begin{array}{r}3\,524\\3\\\hline 10\,572\end{array}\qquad\qquad \times\begin{array}{r}123\,524\\3\\\hline 370\,572\end{array}$$

1. Вылічы.

34 187 · 4 247 341 · 4 108 309 · 6

2. Вылічы паводле ўзору.

22 км 155 м · 3 = 66 км 465 м
22 км 155 м = 22 155 м

$$\times\begin{array}{r}22\,155\\3\\\hline 66\,465\end{array}$$

66 465 м = 66 км 465 м

84 км 306 м · 3 32 км 17 м · 8 41 км 67 м · 2
47 км 266 м · 4 28 км 44 м · 6 185 км 55 м · 4

3. Вылічы. Параўнай вынікі.

65 320 – 5020 78 005 – 19 906 + 6880
65 320 – 5015 78 005 – (19 906 + 6880)
65 320 – 5010 78 005 – 19 906 – 6880

4. Рашы задачу.

Трэцяя частка вышыні тэлеграфнага слупа складае 3 м 15 см. Якая вышыня ўсяго слупа?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

5. Складзі і рашы задачу, не вылічваючы значэння скорасці.



6. Рашы задачу.

Адлегласць ад дома Клавы да школы 675 м. Колькі метраў Клава праходзіць па гэтай дарозе з панядзелка да суботы?

7. Начарці квадрат са стараной 4 см і прамавугольнік са старанамі 3 см і 5 см. Параўнай іх перыметры і плошчы.

Урок 60

1. Рашы задачу.

Два катары адначасова адышлі ад прычала ў процілеглых напрамках. Скорасць першага катара 30 км/г, а скорасць другога — 40 км/г. За які час яны аддаляцца адзін ад аднаго на 210 км?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Спачатку даведаюся, на колькі кіламетраў аддаляліся катары за 1 гадзіну (скорасць аддалення). Потым даведаюся, за які час яны змаглі аддаліцца адзін ад аднаго на 210 км.



2. Рашы задачу.

Два лыжнікі выехалі адначасова з аднаго пасёлка ў процілеглых напрамках. Іх скорасці 15 км/г і 17 км/г. Праз які час адлегласць паміж імі будзе роўна 96 км?



3. Вылічы.

34 209 · 5 + 24 800
109 456 · 2 – 49 299
89 402 · 7 – 293 500

23 409 + 187 354 – 12 476 · 2
(123 893 · 1 + 23 098 · 4) · 1
987 340 – 43 651 · 3 – 41 000

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

4. Рашы ўраўненні.

$x \cdot 3 = 42\ 000$ $\qquad$ $z - 15\ 926 = 15\ 000 \cdot 2$

$23\ 456 + x = 154\ 302$ $\qquad$ $y : 3000 = 60\ 000 : 4$

5. Рашы задачу рознымі спосабамі.

На экскурсію ў цягніку паехалі 20 хлопчыкаў і 16 дзяўчынак. Колькі купэ ў вагонах было занята дзецьмі, калі ў кожным купэ 4 месцы?

6. Рашы задачу.

Маса буханкі хлеба 1 кг. У сям'і 4 чалавекі. За дзень кожны член сям'і з'ядае 200 г хлеба. Ці хопіць дзвюх буханак хлеба на 3 дні?

7. Вылічы.

$20\ 304 - (8056 + 8505)$ $\qquad$ 42 км 178 м · 5

$652 \cdot 4 + 4547$ $\qquad$ 43 км 22 м · 7

$10\ 000 - 512 \cdot 8$ $\qquad$ 75 км 31 м · 4

8. Знайдзі плошчу прамавугольніка *ABCD*. Назаві дыяганалі прамавугольніка. Падумай, як можна знайсці плошчу трохвугольніка *ABC*.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Параўнай вылічэнні. Растлумач запісы.

240 · 4 = 24 дзяс. · 4 = 96 дзяс. = 960

$$\begin{array}{r} \times\ 240 \\ 4 \\ \hline 960 \end{array}$$

Трэба памножыць у слупок 240 на 4, або 24 дзясяткі на 4.
Спачатку памнажаю 24 на 4, таму напішу другі множнік 4 пад лічбай 4 першага множніка.
Памнажаю 24 на 4, атрымліваю 96.
Памятаю, што памнажалі не 24 адзінкі, а 24 дзясяткі, таму перавяду вынік у адзінкі. Для гэтага дапішу справа лічбу 0.

2400 · 4 = 24 сот. · 4 = 96 соц. = 9600

$$\begin{array}{r} \times\ 2400 \\ 4 \\ \hline 9600 \end{array}$$

Трэба памножыць у слупок 2400 на 4, або 24 ... на 4.
Спачатку памнажаю 24 на 4, таму напішу другі множнік 4 ... .
Памнажаю 24 на 4, атрымліваю ... .
Памятаю, што памнажалі не 24 адзінкі, а 24 ... , таму перавяду вынік у адзінкі. Для гэтага дапішу справа ... .

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

2. Выканай множанне ў слупок.

13 500 · 5	134 563 · 4	324 000 · 3
14 400 · 6	47 209 · 6	107 342 · 3
112 000 · 8	29 046 · 9	341 570 · 2

3. Выканай дзяленне з астачай.

56 : 12 63 : 13 84 : 16 79 : 14 96 : 18

4. Рашы задачу.

Міша і Грыша адначасова выйшлі з пад'езда дома і пайшлі ў процілеглых напрамках. Міша ішоў са скорасцю 100 м/мін, Грыша — з такой жа скорасцю. Праз які час адлегласць паміж імі стала роўна 800 м?

5. Складзі і рашы задачу.

Выпрацоўка за 1 г, шт.	Час работы, г	Выпрацоўка за ўвесь час работы, шт.
аднолькавая	4	176
	8	?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Рашы задачу.

Для ўпрыгажэння елкі дзеці зрабілі з паперы 6 сняжынак і 3 зорачкі. На кожны выраб паперы ішло пароўну. На ўсе сняжынкі пайшло 12 дм^2 паперы. Колькі квадратных дэцыметраў паперы пайшло на ўсе зорачкі?

7. Беласнежка на дыяграме паказала рост сваіх сяброў — гномаў. Якую памылку зрабіла Беласнежка? Вызнач рост першых чатырох гномаў у сантыметрах.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

1. Параўнай лікі.

143 ☐ 1143 49 768 ☐ 89 365
235 ☐ 1235 809 456 ☐ 810 456
70 000 ☐ 5600 37 502 ☐ 37 501

2. Складзі выразы, знайдзі іх значэнні.

- Суму лікаў 23 405 і 42 500 павялічыць у 4 разы.
- Да 67 234 дадаць здабытак лікаў 67 498 і 3.
- Здабытак лікаў 245 200 і 3 павялічыць на 5640.

3. Выразі ў большых адзінках вымярэння.

6000 м 560 мм 40 дм 9000 г 370 ц

4. Якія значэнні літары падыходзяць?

45 673 > a 40 640 > b
925 374 < x 69 354 < c

5. Складзі ўраўненні і рашы іх.

- Невядомы лік падзялілі на 1 і атрымалі 23 456.
- Да 21 400 дадалі невядомы лік і атрымалі 42 766.
- Невядомы лік паменшылі ў 4 разы і атрымалі 22 000.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

6. Вылічы.

23 456 + 12 603 – 8452
78 900 – 27 487 + 347
895 400 · 1 – 98 409

706 294 – 234 867 · 0
56 300 · 2 + 27 409
1 · 87 432 – 23 111

7. Параўнай.

57 см 9 мм ☐ 7 дм 5 см 9 мм
46 мм ☐ 4 см
9 дм 4 см ☐ 9040 мм

7 т 80 кг ☐ 780 кг
9 ц 45 кг ☐ 945 кг
600 г ☐ 6 кг

8. Параўнай.

$\frac{1}{2}$ т ☐ 500 кг

$\frac{1}{2}$ сут. ☐ 6 г

24 г ☐ $\frac{1}{4}$ сут.

9. Вылічы.

6446 + 360 : 4 – 2300 · 1
23 475 – 234 · (18 : 2)
800 000 – 13 000 · (64 : 8)

237 : 3 · 8 + 21 603
714 : 6 · 9 – 678 · 1
936 : 4 + 78 400 – 984

10. Вылічы.

34 567 · 2 + 209 450
675 390 – 12 311 · 4

(341 289 – 134 209) · 1
0 · (231 467 · 1 – 23 490)

11. Рашы ўраўненні.

x + 452 = 894
k – 31 674 = 2752
a + 4420 = 9868

a – 45 600 = 74 200
x + 231 = 678
12 410 – k = 3600

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

12. Запішы лікі. Параўнай.

56 тыс. 3 сот. 4 адз. ☐ 65 тыс. 3 сот. 3 адз.
68 тыс. 5 соц. 2 адз. ☐ 69 тыс. 2 сот. 5 дзяс. 1 адз.
78 тыс. – 34 тыс. ☐ 79 тыс. – 37 тыс.

13. Запоўні табліцу. Выкарыстай калькулятар.

Складаемае	387 257	805 819	590 300	308 187
Складаемае	23 567	1280	215 987	34 608
Сума				

14. Выканай множанне.

6700 · 4	56 309 · 4	23 500 · 3
205 675 · 3	266 000 · 3	19 087 · 8
182 000 · 4	34 740 · 3	37 220 · 2

15. Рашы задачу.

Ці зможа цягнік прайсці 500 км за 7 г, калі скорасць яго руху 80 км/г?

16. Рашы задачу.

Гаспадыня купіла $\frac{1}{2}$ кг тварагу і $\frac{1}{4}$ кг смятаны. Колькі грамаў тварагу і смятаны купіла гаспадыня?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

17. Рашы задачу.

Калі ў першы клас унеслі 7 крэслаў, а ў другі — 12 крэслаў, у класах стала крэслаў пароўну. Колькі крэслаў было ў другім класе, калі ў першым іх было столькі, колькі ўнеслі ў абодва класы?

18. Рашы задачу.

У касе цырка за дзень было прададзена 1225 білетаў. Дзіцячыя білеты склалі $\frac{3}{5}$ часткі гэтых білетаў. Колькі было прададзена білетаў для дарослых?

19. Рашы задачу.

З кавалка тканіны можна пашыць 48 дзіцячых сукенак або 24 жаночыя сукенкі. На адну дзіцячую сукенку ідзе 2 м тканіны. Колькі метраў тканіны ідзе на кожную жаночую сукенку?

20. Рашы задачу, не вылічваючы значэння скорасці.

За 5 г машына праехала 473 км. Колькі кіламетраў праедзе машына за 10 г, рухаючыся з той жа скорасцю?

21. Рашы задачу.

Самалёт можа праляцець 4500 км за 5 г. Якую адлегласць ён праляціць за гэты час, калі зменшыць скорасць на 120 км/г?

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

22. Якія выразы падыходзяць да ўмовы задачы, а якія — не?

У магазін прывезлі 16 780 альбомаў у пачках, па a штук у кожным, і 5784 кнігі ў пачках, па b штук у кожным.

$16\,780 : a$	$5784 : b$
$16\,780 : a + 5784 : b$	$16\,780 + 5784$
$16\,780 - a$	$5784 + b$

23. Рашы задачу.

З двух партоў адначасова насустрач адзін аднаму выйшлі два цеплаходы і праз 2 г сустрэліся. Скорасць першага цеплахода — 32 км/г, а другога — на 3 км/г большая. Знайдзі адлегласць паміж партамі.

24. Пабудуй прамавугольнік *ABCD* з даўжынямі старон 6 см і 2 см. Знайдзі перыметр і плошчу гэтага прамавугольніка. Начарці дыяганалі.

25. Пабудуй прамавугольны трохвугольнік *ABC*. Падзялі старану *BC* напалову і абазнач яе сярэдзіну пунктам *O*. Атрыманы пункт — цэнтр акружнасці, а адрэзак *OB* — яе радыус. Начарці гэту акружнасць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

26. Начарці акружнасці з радыусам 2 см так, як паказана на малюнку. Колькі агульных пунктаў у гэтых акружнасцей?

27. Рашы задачу.

Перыметр пяцівугольніка 60 см. Сума даўжынь чатырох яго старон роўна $\frac{4}{5}$ часткам перыметра. Знайдзі даўжыню пятай стараны.

28. Начарці акружнасць. Правядзі два дыяметры. Гэтыя дыяметры — дыяганалі чатырохвугольніка. Начарці гэты чатырохвугольнік.

29. Начарці прамавугольны трохвугольнік *ACB*. Правядзі вакол яго акружнасць паводле ўзору. Злучы пункты *A* і *B* з пунктам *M* на акружнасці. Правер, ці з'яўляецца вугал *AMB* вострым? Тупым? Прамым?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

30. Запоўні табліцу.

Даўжыня прама-вугольніка, дм	Шырыня прама-вугольніка, дм	Перыметр, дм	Плошча, дм^2
23	3	?	?
8	?	20	?
?	3	?	90
7	?	?	56

31. Здагадайся, колькі часу паказваюць гадзіннікі.



32. Праз паўгода наступіць жнівень. Які месяц цяпер? Які месяц наступіць праз $\frac{1}{3}$ года?

33. Вызнач стагоддзе.

1067 г. 567 г. 2000 г. 2017 г.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

34. Вылічы.

1279 + 3191	8208 + 1277	1098 + 6093
4152 + 2304	3678 + 2719	3009 + 238

35. Рашы задачу.

Перыметр прамавугольніка 18 см. Даўжыня адной яго стараны 6 см. Знайдзі даўжыню другой стараны прамавугольніка.

36. Рашы задачу.

На двух паліцах было кніг пароўну. З першай паліцы на другую пераставілі 15 кніг. На колькі больш кніг стала на другой паліцы, чым на першай?

37. Параўнай.

980 908 і 908 980	50 100 і 50 010
200 120 і 201 020	101 010 і 101 100

38. Прачытай і выпішы трохзначныя лікі.

Павяліч кожны лік на 5465.

23 456 380 109 45 309 487 201

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

ЗМЕСТ

Паўтарэнне 3

Урокі 1—8. Паўтарэнне вывучанага ў 4 класе 3

Нумарацыя лікаў ад 1 да 1 000 000 14

Урок 9. Клас адзінак і клас тысяч 14

Урок 10. Чытанне мнагазначных лікаў.....16

Урок 11. Запіс мнагазначных лікаў 19

Урок 12. Разрадны састаў мнагазначных лікаў. Прадстаўленне мнагазначнага ліку ў выглядзе сумы разрадных складаемых.....21

Урок 13. Параўнанне мнагазначных лікаў 23

Урокі 14—15. Замацаванне.....26

Урок 16. Складанне і адніманне, заснаваныя на вылічэннях у межах 100 30

Урок 17. Множанне і дзяленне, заснаваныя на вылічэннях у межах 100 32

Урок 18. Цыркуль.....34

Урок 19. Акружнасць і круг 36

Урок 20. Задачы на знаходжанне некалькіх долей ліку.....39

Урокі 21—22. Замацаванне.....41

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Складанне і адніманне мнагазначных лікаў 45

Урок 23. Абагульненне і сістэматызацыя вывучанага: перамяшчальная і спалучальная ўласцівасці складання 45

Урок 24. Пісьмовае складанне і адніманне мнагазначных лікаў без пераходу праз разрадную адзінку 48

Урок 25. Пісьмовае складанне мнагазначных лікаў з утварэннем разраднай адзінкі. Пісьмовае адніманне ад круглага мнагазначнага ліку 50

Урок 26. Пісьмовае складанне і адніманне мнагазначных лікаў з пераходам праз разрадную адзінку 52

Урокі 27—28. Замацаванне 54

Урок 29. Скорасць. Простыя задачы на рух.....57

Урок 30. Простыя задачы на рух.....60

Урок 31. Квадратны дэцыметр.....62

Урок 32. Калькулятар. Праверка складання і аднімання з дапамогай калькулятара 64

Урокі 33—35. Замацаванне 66

Урок 36. Састаўныя задачы на рух 72

Урок 37. Рашэнне ўраўненняў выгляду $a + x = b$ з мнагазначнымі лікамі 74

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Урок 38. Складанне ураўненняў з мнагазначнымі лікамі. Пабудова прамавугольнага трохвугольніка 76
Урок 39. Стагоддзе 78
Урок 40. Парадак выканання дзеянняў у лікавых выразах без дужак.....81
Урок 41. Парадак выканання дзеянняў у лікавых выразах з дужкамі 84
Урокі 42—43. Замацаванне 86
Урок 44. Задачы на рух.....90
Урок 45. Пісьмовае складанне і адніманне лікавых значэнняў даўжыні 92
Урок 46. Пісьмовае складанне і адніманне лікавых значэнняў масы.....95
Урок 47. Пісьмовае складанне і адніманне лікавых значэнняў плошчы.....98
Урокі 48—49. Замацаванне 100
Урок 50. Задачы на рух у процілеглых напрамках.....104
Урок 51. Квадратны метр.....106
Урок 52. Гектар 108
Урок 53. Задачы на сустрэчны рух 110
Урокі 54—55. Замацаванне 113

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Множанне і дзяленне мнагазначных лікаў 117

Урок 56. Абагульненне і сістэматызацыя вывучанага: перамяшчальная ўласцівасць множання. Множанне з лікамі 0 і 1 117

Урок 57. Абагульненне і сістэматызацыя вывучанага: размеркавальная ўласцівасць множання 119

Урок 58. Пісьмовае множанне мнагазначнага ліку на адназначны без пераходу праз разрадную адзінку 122

Урок 59. Пісьмовае множанне мнагазначнага ліку на адназначны з пераходам праз разрадную адзінку 125

Урок 60. Задачы на рух у процілеглых напрамках 126

Урок 61. Пісьмовае множанне мнагазначнага ліку на адназначны (выпадкі выгляду 240 · 4) 129

Урокі 62—64. Замацаванне 132

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва і нумар школы)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Вучэбнае выданне

Тамукевіч Вольга Тадэвушаўна
Урбан Марыя Анатольеўна

МАТЭМАТЫКА

Вучэбны дапаможнік для 5 класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ з беларускай мовай навучання

У 2 частках
Частка 1

Рэдактар *Т. М. Ракіцкая*
Мастак вокладкі *Н. А. Хромава*
Мастакі *В. Я. Каляскова, Н. М. Хаманеева, Н. А. Хромава*
Камп'ютарны набор *Т. М. Ракіцкай, Н. М. Хаманеевай*
Камп'ютарная вёрстка *Н. М. Хаманеевай*
Карэктар *Т. М. Ракіцкая*

Падпісана ў друк 11.09.2013. Фармат $70\times90\ ^{1}/_{16}$. Папера афсетная № 1.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,53. Ул.-выд. арк. 4,5.
Тыраж 955 экз. Заказ

РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
ЛИ № 02330/639 ад 31.01.2012.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

ААТ «Друкарня "Перамога"».
ЛП № 02330/429 ад 28.01.2013.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне